РЫНАК
ЗАПРАШАЕ "КАМАРОЎКА" 2 стар.
АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ
ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ 2 стар.
ДЫЯКУР'ЕР: ПРЫЗНАЧЭННІ, НОВАЕ У ВІЗАВЫМ РЭЖЫМЕ – ЗША, ФІНЛЯНДЫЯ, ТУРКМЕНІСТАН 3 стар.

ГАСЦЁЎНЯ
ЯК "РАДЗІМІЧЫ" "ЗАВАЯВАЛІ КАРЭЮ" 4 стар.
ХРЫСЦІЯНСКАЯ СТАРОНКА "ЖЫЦЦЁ І ВЕРА" 5 стар.
ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ: РАСІЯ, ЛАТВІЯ 6 стар.

АСОБА Ў БЯЗМЕЖЖЫ ЧАСУ
УСПАМІНЫ Міколы ДЗЕЛЯНКОЎСКАГА ПРА НОВІКА-ПЯЮНА 7 стар.
"ЗДЫМКІ ЖЫЦЦЯ" Глеба ЛАБАДЗЕНКІ 8 стар.
СЛУХАЙ СВАЁ
ДЗЕ НАБЫЦЬ БЕЛАРУСКІЯ РОК-КАСЕТЫ! 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

# Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

6 лютага 2002 года, № 6 (2772) Цана 122 рублі E-mail:golas_radzimy@tut.by

*хроніка жыцця*

## НАФТАВІКІ – САМЫЯ ЗАМОЖНЫЯ

***Па даных Міністэрства статыстыкі, у мінулым годзе заработная плата жыхароў Беларусі павялічылася на 30,3 працэнта.***

Так, у снежні сярэднямесячны заработак склаў 166,2 тысячы рублёў. Цікава, што за гэты час мінімальны спажывецкі бюджэт вырас на 24 працэнты і ў апошнім месяцы года склаў 103,5 тысячы рублёў на чалавека. Што тычыцца даходаў беларускіх грамадзян, то самыя нізкія яны ў калгаснікаў — 80 тысяч рублёў. Сярод рэгіёнаў найвышэйшыя паказчыкі па зарплаце ў Мінску, самыя нізкія — у Гродзенскай вобласці.

## БУДОЎЛІ МАСКВЫ ЗАПРАШАЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ

***Маскоўскі ўрад хутка выдзеліць квоту на працу магілёўскім будаўнікам.***

Пра гэта дамовіліся ў час нядаўняй сустрэчы мэр Масквы Юрый Лужкоў і губернатар Магілёўскай вобласці Барыс Батура. Беларусы, чый вопыт работы ўжо станоўча ацанілі расіяне, прымуць удзел у будаўніцтве жылля на Сакольніцкім вале і ў раёне Паўночнага Ізмайлава. Масква зараз вельмі інтэнсіўна будуецца і рэканструюецца, таму, па словах мясцовых улад, працы магіляўчанам хопіць на дзесяцігоддзі. Апошніх гэта толькі радуе, бо з-за недахопу капітальных укладанняў дома не заўсёды ёсць для іх работа. Экспарт паслуг дапаможа вырашыць гэту праблему.

## ПРАПАНОВЫ І СКАРГІ – НА «ГАРАЧУЮ ЛІНІЮ»

***Жыхары краіны ў большасці сваёй па-ранейшаму карыстаюцца бясплатнымі медыцынскімі паслугамі.***

Але ў адрозненне ад прыватнай платнай медыцыны дзяржаўныя ўстановы ўсё часцей выклікаюць незадавальненне грамадзян. У сувязі з гэтым Камітэтам дзяржаўнага кантролю пачата комплексная праверка Міністэрства аховы здароўя і падначаленых яму ўстаноў: бальніц, аптэчнай сеткі, фармакалагічных прадпрыемстваў. Правяраючыя вывучаюць эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўнай уласнасці і бюджэтных сродкаў, арганізацыю лячэбнага працэсу і г. д. У сувязі з гэтым у сталіцы і ва ўсіх абласных цэнтрах працуюць "гарачыя лініі", куды можа патэлефанаваць кожны і выказаць свае прапановы па ўдасканаленні сістэмы аказання медыцынскіх паслуг і рэфармаванню галіны.

## ЛЁС МІЛЬЁННАГА ЖЫХАРА

***30 гадоў таму — 25 студзеня 1972 года ў Мінску нарадзіўся мільённы жыхар.***

Для беларускай сталіцы гэта была значная падзея, пра што з захапленнем пісалі ўсе сродкі масавай інфармацыі. Бацькам маленькага "мільянера", якія жылі ў заводскім інтэрнаце, мясцовыя ўлады нават уручылі ключы ад двухпакаёвай кватэры. Але ішоў час, і пра лёс таго самага хлопчыка — Алега Басько — нічога не было вядома.

Як нядаўна высветлілася, 30-гадовы Алег і зараз жыве з бацькамі ў той самай кватэры. Ён паспяхова скончыў школу і цяпер займаецца дробным прыватным бізнесам: прадае на рынках дзіцячыя каляскі. Акрамя таго, Алег Басько марыць зрабіць у сваім жыцці што-небудзь сур'ёзнае. Дарэчы, ён вельмі прыемны мапады чалавек: у яго зялёныя вочы, а рост — 1,8 метра.

На здымку з архіва БелТА мільённы жыхар Мінска трыццаць гадоў назад.

## ВОДГАЛАС ВАЙНЫ

***Больш за паўстагоддзя прайшло пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, але напамін пра яе і зараз ляжыць у беларускай зямлі.***

Толькі за апошнія дзесяць гадоў сапёры інжынерных войскаў краіны абясшкодзілі 255 тысяч адзінак баявых снарадаў, у тым ліку 6,5 тысячы ў мінулым годзе. Па ацэнках ваенных спецыялістаў, каля 350 квадратных кіламетраў тэрыторыі Беларусі яшчэ падлягаюць размініраванню. Больш за ўсё небяспечных "цацак" вайны знаходзіцца ў Віцебскай вобласці.

Акрамя нейтралізацыі гэтых смяротных скарбаў, інжынерныя войскі клапоцяцца пра ўтрыманне 4,5 мільёна супрацьпяхотных мін, якія мае ў сваім арсенале Беларусь. У перспектыве ўся гэтая зброя павінна быць знішчана. На яе ліквідацыю спатрэбіцца 50 мільёнаў долараў ЗША.

## СУРАК ПАМІРАЕ

***Адзіны ў Беларусі слон, які знаходзіцца ў Гродзенскім заапарку, цяжка захварэў. Спецыялісты не выключаюць, што прычынай цяжкага стану жывёліны з'яўляецца сталы ўзрост.***

Сураку споўнілася 45 гадоў, а спаны гэтага віду жывуць у няволі не больш за 50. Гродзенцы звярнуліся па кансультацыю да капег у Маскоўскі заапарк і на свае ўласныя грошы набываюць неабходныя медыкаменты для аказання Сураку экстраннай дапамогі. Як гавораць супрацоўнікі заапарка, мацней за ўсіх жывёл за паміраючага слана перажывае вярблюд Фая.

Падрыхтавала **Ларыса ЛАЗАР.**

*знак якасці*

## УНІКАЛЬНЫ ПРАКАТНЫ СТАН

***За паўгода, як і меркавалася, на Беларускім металургічным заводзе выйшаў на праектную магутнасць унікальны для СНД пракатны стан-150.***

Зараз стан вырабляе 27 500 тон сталі катанай, асноўным спажыўцом якой на Беларусі з'яўляецца Рэчыцкі завод вырабаў з металу.

Прадукцыя БМЗ рэалізуецца таксама ў Расіі, дзе галоўны яе спажывец — аўтагігант ВАЗ, ідзе ў краіны Паўночнай Еўропы, ёсць дамоўленасць аб пастаўках у Італію і Германію.

НА ЗДЫМКУ: на галоўным пасту кіравання станам.

**Сяргей ХАЛАДЗІЛІН,** БелТА.

*зваротная сувязь*

МАЛДОВА

Беларусы Малдовы — чытачы вашай газеты — выказваюць рэдакцыі "Голасу Радзімы" найлепшыя пажаданні.

Няхай 2002 год прынясе ўсім здароўе і моц для плённай працы на карысць нашай маці-Радзімы Беларусі.

Добра робіце, што на старонках газеты даяце кароткую інфармацыю аб важных падзеях з жыцця Беларусі. "Голас Радзімы" стаў цікавай газетай, і мы жадаем, каб яна такой і заставалася.

З павагай
**Уладзімір ДЗЯРЖЫЦКІ,**
старшыня Рады Беларускай грамады Рэспублікі Малдова.

*пашанцавала*

Удалай аказалася пакупка тэлевізара "Віцязь" для віцяблянкі Марыны Сахаравай у гандлёвым доме завода "Віцязь": яна стала ўдзельніцай розыгрышу прызоў і выйграла пральную машыну "Індэзіт" (на здымку).

**Аляксандр ХІТРОЎ,** БелТА.

*надзённа*

## МУЗЕІ РЫХТУЮЦЦА ДА ЮБІЛЕЯЎ ПЕСНЯРОЎ

***Як паведамлялася, 6 снежня 2001 года адбылося першае пасяджэнне Нацыянальнага аргкамітэта па правядзенні ўрачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы (7 ліпеня) і Якуба Коласа (3 лістапада). Старшыня аргкамітэта, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Дражын зацвердзіў план юбілейных мерапрыемстваў, якія пройдуць у Беларусі на працягу 2002 года. План прадугледжвае мноства разнастайных імпрэз, у прыватнасці, правядзенне міжнародных навукова-практычных канферэнцый, конкурсаў кампазітараў на лепшае вакальнае сачыненне па матывах твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, на лепшы твор літаратуры, прысвечаны юбілею паэтаў, выпуск паштовых марак і канвертаў, юбілейных манет, значкоў, выданне зборнікаў твораў і г. д.***

***Галоўнымі асяродкамі па вывучэнню жыцця і папулярызацыі творчасці нашых знакамітых паэтаў з'яўляюцца дзяржаўныя музеі — літаратурны Янкі Купалы і мемарыяльны Якуба Коласа ў Мінску. Якімі будуць клопаты музеяў у юбілейны год? Што яны рыхтуюць з вызначаных мерапрыемстваў? З такімі пытаннямі наш карэспандэнт звярнуўся да дырэктараў гэтых устаноў Жанны ДАПКЮНАС і Зінаіды КАМАРОЎСКАЙ.***

Заканчэнне на 3-й стар.

*сітуацыя*

## БАБРЫ ПАСЯЛІЛІСЯ Ў АЧЫШЧАЛЬНЫХ ЗБУДАВАННЯХ

У апошні час заўважана расселенне баброў у Гродзенскай вобласці ў раней нехарактэрных для іх месцах.

У прыватнасці, гэты рэдкі від жывёл засяляе нават меліяратыўныя каналы. А нядаўна папуляцыя баброў была выяўлена на палях ачышчальных збудаванняў каля Мастоў.

**Вераніка БОХАН.**

*рэклама*

«КРЫНІЦА»

САНАТОРЫЙ, ДЗЕ МОЖА ПАМАЛАДЗЕЦЬ КОЖНЫ

Тут вы пазбавіцеся ад захворванняў органаў стрававання і проста выдатна адпачняце.

Санаторый "Крыніца" размешчаны ў прыгарадзе Мінска на маляўнічым беразе вадасховішча.

Высокапрафесійныя спецыялісты, сучасныя лячэбна-дыягнастычныя кабінеты, жыватворныя крыніцы з мінеральнай вадой і лячэбныя гразі дапамогуць вам ачысціць арганізм, вярнуць здароўе, цудоўны настрой, падораць незабыўныя дні на беларускай зямлі.

Кошт пуцёўкі на 21 дзень — ад 310 да 500 долараў ЗША.

**Наш адрас:** 223033, вёска Ждановічы, Мінскі раён, Беларусь, тэл./факс: (375-17) 50-98-196.

*аспект праблемы*

# РЭАЛІЗАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПРЫЯРЫТЭТАЎ – ПРАЗ НАВУКУ

***Некаторыя выдатныя дасягненні беларускіх вучоных могуць прэтэндаваць на Нобелеўскую прэмію, сцвярджае старшыня Камітэта па навуцы пры Савеце Міністраў Анатоль ЛЕСНІКОВІЧ.***

Да такіх распрацовак ён, у прыватнасці, адносіць створаны ў Белдзяржуніверсітэце новы тып аб'ёмнага лазера на свабодных электронах, якому няма аналагаў у свеце. Навінка прайшла іспыты ў мінулым годзе, і, па словах Анатоля Іванавіча, яе перспектывы вельмі і вельмі добрыя. Плённа працуюць беларускія вучоныя і ў Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследаванняў.

Калі ж гаварыць у цэлым аб працы навукоўцаў краіны, то летась у выніку ўкаранення іх распрацовак была арганізавана серыйная вытворчасць больш за 500 новых відаў машын, абсталявання і прыбораў, засвоена 375 новых тэхналагічных працэсаў, уведзена ў эксплуатацыю каля сямі дзесяткаў сістэм і комплексаў і г. д. Для параўнальна невялікай дзяржавы гэта вельмі нядрэнныя паказчыкі. Тым больш, што значная колькасць засвоеных у 2001 годзе распрацовак (42 працэнты) істотна перавышае аналагічныя паказчыкі нават у высокаразвітых краінах, дзе нормай лічыцца 10 працэнтаў. Пры гэтым аб'ём продажу выпушчанай толькі машына- і прыборабудаўнічай прадукцыі, па папярэдніх даных, перавысіў 200 мільёнаў долараў, у той час як гадавы аб'ём бюджэтнага фінансавання ўсіх навукова-тэхнічных праграм склаў каля 20 мільёнаў долараў

Усё гэта сведчыць пра тое, што наша зямля не збяднела на таленты і нават у самыя складаныя гады эканамічнага крызісу Беларусь змагла захаваць навуковы патэнцыял, ядро навуковых калектываў і вядучыя навуковыя школы. Толькі ў Нацыянальнай акадэміі навук даследаваннямі і распрацоўкамі займаюцца 7,5 тысячы чалавек, у тым ліку 76 акадэмікаў, 104 члены-карэспандэнты, 500 дактароў навук і больш за 1 800 кандыдатаў. Навуковыя творчыя калектывы працуюць амаль у кожным міністэрстве, у рэгіёнах. І менавіта вучоным удалося зрабіць нямала для таго, каб пераарыентаваць нацыянальную эканоміку і культуру на работу ў новых рынкавых умовах, стварыць неабходныя прававыя перадумовы для працы навуковых арганізацый і, галоўнае, захаваць аўтарытэт Беларусі як дзяржавы з развітой эканомікай.

Хаця гэты шлях, безумоўна, не быў лёгкім і бязвоблачным. Навукоўцам прыйшлося сутыкнуцца з праблемамі, характэрнымі для ўсіх постсавецкіх рэспублік: нястача фінансавых сродкаў, адток спецыялістаў. Толькі за апошнія пяць год з краіны па розных прычынах паехалі 400 вучоных, у тым ліку 60 дактароў навук і 200 кандыдатаў. Па словах прэзідэнта Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіла Мясніковіча, гэта трывожны факт, і ў краіне трэба правесці комплекс мерапрыемстваў па замацаванні і вяртанні навуковых кадраў. А гэта не толькі павышэнне заработнай платы і наяўнасць добрай матэрыяльнай базы для творчасці і даследаванняў, але і адчуванне сваёй запатрабаванасці. Як гаворыць Міхаіл Уладзіміравіч, вялікая ўвага зараз надаецца і амаладжэнню навуковых кадраў, прыцягненню ў гэтую сферу маладых таленавітых спецыялістаў.

Увогуле трэба адзначыць, што ў апошнія гады адносіны дзяржавы да айчыннай навукі карэнным чынам змяніліся. Адышлі ў мінулае тыя часы, калі ў запале палітычных хваляванняў і дыскусій дзяржаўныя дзеячы на навуку папросту забываліся, а таленавітыя вучоныя выжывалі, як маглі. Іншая справа, што фінансавыя магчымасці краіны пакуль не могуць задаволіць усе патрэбы навукі і тых, хто прысвяціў сваё жыццё служэнню ёй. Але стратэгія дзяржавы ў гэтай важнейшай сферы вызначана досыць дакладна. У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2001—2005 гады гаворыцца, што навука з'яўляецца галоўным інструментам рэалізацыі нацыянальных прыярытэтаў. А гэта значыць, вучоныя адчуваюць сваю запатрабаванасць і неабходную падтрымку з боку дзяржавы. Напрыклад, на фундаментальныя даследаванні (і гэта ўпершыню!) сёлета плануецца патраціць не менш як 30 працэнтаў сродкаў, выдзеленых з бюджэту на развіццё ўсёй навуковай сферы.

Разам з тым, лічыць Міхаіл Мясніковіч, навуковы патэнцыял выкарыстоўваецца пакуль не поўнасцю. Каб навука працавала больш эфектыўна, неабходна якаснае паляпшэнне яе дзейнасці. Гэта, у прыватнасці, рэфармаванне сістэмы арганізацыі акадэмічнага, вузаўскага і галіновага сектараў навукі, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання навукова-інтэлектуальнага патэнцыялу краіны, удасканаленне інавацыйнай дзейнасці, рэалізацыя шэрагу праграм, умацаванне стымулявання працы навуковых работнікаў і г. д. Блок такіх дакументаў падрыхтаваны. А ў бліжэйшыя паўгода ў НАН будуць распрацаваны прыярытэтныя напрамкі развіцця айчыннай навукі.

**Ларыса ЛАЗАР.**

*здарэнні*

## «ДЗІВА-ПРЫБОР» – ЗАТАННА

***Невядомыя прадаўцы дзіва-прыбора, які "вылечвае" ўсе хваробы, правялі серыю "прэзентацыйных" продажаў на тэрыторыі Навагрудскага і Лідскага раёнаў.***

Хтосьці з наіўных сялян, сярод якіх аказалася многа старых, шчыра паверыў, што апарат коштам 200 тысяч рублёў прадаюць з вялікай скідкай, а розніцу ў кошце даплаціць капгас. Тых, хто сумняваўся, стараліся ўгаварыць набыць цуд тэхнікі, запэўніваючы, што ён мае унікальныя якасці — напрыклад, дапаможа старым вярнуць патэнцыю.

Наіўныя людзі зразумелі, што іх падманулі, толькі з цягам часу, калі ўпэўніліся, што прыбор не дапамагае. "Набегі" махляроў на Гродзеншчыну аказаліся такімі імклівымі, што затрымаць іх не ўдалося. Супрацоўнікі міліцыі пастараліся толькі паведаміць як мага большай колькасці грамадзян, каб яны не куплялі і не "купляліся".

*паляўнічы сезон*

## ТРАФЕІ ПАВЕЗЛІ Ў ВЕНУ

***Паляўнічыя трафеі павезлі з Асіповіч два еўрапейцы. Амаль тыдзень яны правялі ў лясных угоддзях Асіповіцкага раёна. Падстрэлілі выбракаванага зубра і двух дзікоў.***

Як паведаміў карэспандэнту БелТА спецыяліст Асіповіцкага лясгаса Антон Шабовіч, адзін з паляўнічых — доктар медыцынскіх навук. У сталіцы Аўстрыі Вене ў яго свая паліклініка, аптэка. Ён паляваў ужо ў многіх краінах свету. У Асіповіцкім раёне яму спадабаліся выдатныя лясныя ўгоддзі, прыём, абслугоўванне і беларуская гасціннасць. Ён пабываў тут у мінулым годзе. Цяпер запрасіў з сабой свайго сябра з нямецкага горада Дортмунда.

Для лясгаса платнае паляванне — магчымасць зарабіць валюту. Цяпер гэта некалькі тысяч еўра. Паляваць жа ў асіповіцкіх лясах ёсць на каго. Тут водзяцца дзікі, вялікі статак аленяў і іншых жывёл. У 1997 годзе сюды завезлі з Белавежскай пушчы 15 зуброў. За гэты час сям' я іх больш чым падвоілася і цяпер складае 36 галоў.

**Мікалай НАЗАРОВІЧ, БелТА.**

*рынак*

# «КАМАРОЎКА» ЗАПРАШАЕ

***Кожны жыхар сталіцы хоць раз у месяц абавязкова наведвае "Камароўку" — так называецца ў народзе унітарнае прадпрыемства "Мінскі Камароўскі рынак".***

Яшчэ зусім нядаўна само слова "Камароўка" ўспрымалася як сінонім шумнага і не зусім чыстага месца. У канцы мінулага года рэканструкцыя ўсё значна змяніла, і галоўны рынак краіны стаў па-сапраўднаму сучасным гандлёвым цэнтрам.

Пад абноўленым вялікім купалам цэнтральнага павільёна ўстаноўлены новыя прылаўкі з халадзільным абсталяваннем. Рынак стаў падобны на буйны супермаркет. Зніклі прадаўцы прамтавараў. Застаўся толькі гандаль прадуктамі. Чыста. Ходзіш па радах, выбіраеш, таргуешся. І, як правіла, паход на рынак па пэўны тавар заўсёды заканчваецца і незапланаванымі пакупкамі: вельмі ўжо шмат спакус.

Змяніліся і рады сезоннага гандлю. Над новымі прылаўкамі з'явіліся элегантныя празрыстыя дахі, пад нагамі – фігурная плітка, пакладзеная спецыяльным спосабам, які дазваляе захоўваць яе заўсёды сухой. Павільёны, дзе прадаюцца прадукты, якія хутка псуюцца, абсталяваны сучаснымі халадзільнымі ўстаноўкамі.

Не пазнаць і плошчу, што прымыкае да рынку. Кіёскі аптавікоў перанесены ў іншае, спецыяльна адведзенае і добраўпарадкаванае месца. Калісьці пастаянна брудная плошча таксама вымашчана фігурнай пліткай. У цэнтры плошчы – фантан, асабліва прыгожы вечарам у падсветцы ліхтароў.

Не відаць і машын, якія раней загрувашчвалі блізкія вуліцы. Цяпер яны схаваныя ў вялікім шматпавярховым сучасным паркінгу. Словам, Камароўскі рынак становіцца адным з месцаў, якое з задавальненнем наведваюць мінчане і госці сталіцы.

**Таццяна КУВАРЫНА.**

## ДЛЯ АМАТАРАЎ ПАРАЎНОЎВАЦЬ ПРЫВОДЗІМ ЦЭНЫ НА АСНОЎНЫЯ ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ

**Гародніна (у рублях за 1 кілаграм):**
бульба – 350—550,
буракі – 400—600,
цыбуля – 650—700,
капуста свежая — 600—750.

**Садавіна:**
яблыкі – 500—3 500,
бананы — 1 000—2 000,
лімоны — 1 000—2 000,
апельсіны — 1 600—2 000,
вінаград — 2 000—4 500,
журавіны — 1 800—2 000,
гранат — 3 500—4 000,
хурма — 1 400—5 000,
ківі (1 шт.) — 370—500,
ананас (1 шт.) — 4 500—8 500.

**Сухафрукты:**
курага — 1 700—3 000,
чарнасліў — 2 500—3 500,
інжыр — 2 800—3 800,
фінікі — 1 700—1 800.

**Арэхі:**
грэцкія — 1 900—3 000,
арахіс — 1 700—2 200,
фундук — 4 000—10 000.

**Мяса:**
свініна — 2 800—5 500,
цяляціна — 2 800—6 500,
ялавічына – 2 500—6 000,
шынка — 4 000—5 000,
сала стандартнае — 2 200—2 800,
бараніна — 4 000—7 000,
куры – 2 300—3 100,
гусі — 5 000—6 000,
сасіскі — 2 800—4 700,
калбаса вараная — 2 850—5 350,
Яйкі — 895—2 500,
Алей — 1 400—1 800.

**Малочныя прадукты:**
масла сметанковае — 3 500—4 200,
смятана — 1 600—2 000,
тварог — 1 800—3 000.
Мука — 440—650.
Цукар — 740—800.
Мёд — 6 000—10 000.

**Рыбапрадукты:**
гарбуша с/м — 3 000—3 200,
аргенціна с/м — 3 100—3 200,
скумбрыя с/м — 2 800—3 200,
мінтай с/м — 2 900—3 000,
карп жывы — 1 730—2 690,
сёмга сал. — 18 000—20 000,
палтус вэндж. — 12 000—16 000,
асятрына вэндж. — 25 000—30 000,
ікра кетавая (140 г) — 5 000—8 000,
ікра паюсная (113 г) — 19 000—20 000.

** Курс долара ЗША на момант выхаду газеты складаў 1 630 рублёў за 1 долар ЗША.*

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

*дыпкур'ер*

### ПРЫЗНАЧАНЫ КІРАЎНІКІ ДЭПАРТАМЕНТАЎ У СТРУКТУРЫ МЗС

***У адпаведнасці з загадам міністра замежных спраў Міхаіла Хвастова прызначаны кіраўнікі дэпартамента каардынацыі знешнеэканамічнай дзейнасці, дэпартамента Еўропы і дэпартамента арганізацыйнай работы і дакументацыі. Згаданыя дэпартаменты ўтвораны ў сістэме МЗС з 1 студзеня 2002 года.***

**Дырэктарам дэпартамента каардынацыі знешнеэканамічнай дзейнасці прызначаны Аляксандр Куцэлай.** Галоўныя задачы дэпартамента — аналіз знешнеэканамічнай дзейнасці, распрацоўка і ажыццяўленне мерапрыемстваў па стымуляванні экспарту і інвестыцый, пытанні тарыфнага і нетарыфнага рэгулявання, рэгістрацыя сумесных і замежных прадпрыемстваў, выдача дазволаў на адкрыццё прадстаўніцтваў замежных фірм, каардынацыя працы па далучэнні Беларусі да Сусветнай гандлёвай арганізацыі, правядзенне антыдэмпінгавых расследаванняў і іншае.

**Дырэктарам дэпартамента Еўропы прызначаны Віктар Шых.** На гэты дэпартамент ускладзены задачы па распрацоўцы і практычнай рэалізацыі знешняй палітыкі Беларусі ў дачыненні да краін Еўропы і еўрапейскіх структур. У функцыі дэпартамента ўваходзіць ажыццяўленне комплексу мерапрыемстваў па развіцці і актывізацыі палітычных, эканамічных, гуманітарных, культурных адносін нашай краіны з краінамі Еўропы як на двухбаковай аснове, так і праз еўрапейскія структуры, а таксама пытанні агульнаеўрапейскай інтэграцыі і іншае.

**Дырэктарам дэпартамента арганізацыйнай работы і дакументацыі прызначана Галіна Аверкіна.** Дэпартамент ажыццяўляе планаванне работы Міністэрства замежных спраў і кантроль за рэалізацыяй планаў, арганізацыю работы калегіі МЗС і забеспячэнне выканання рашэнняў калегіі, падрыхтоўку графікаў міжнародных візітаў і сустрэч на вышэйшым і высокім узроўнях, дакументацыйнае забеспячэнне дзейнасці міністэрства, арганізацыю работы ведамаснага архіва і ведамаснай бібліятэкі і іншае.

### УВЕДЗЕНА НОВАЯ АНКЕТА — ЗАЯВА ДЛЯ АТРЫМАННЯ НЕІМІГРАЦЫЙНАЙ ВІЗЫ НА ЎЕЗД У ЗША

***Па рашэнні Дзяржаўнага дэпартамента ЗША ўведзена ў дзеянне новая анкета-заява для атрымання неіміграцыйнай візы на ўезд у ЗША, а таксама яшчэ адна дадатковая форма.***

Апошняя запаўняецца асобамі ва ўзросце ад 16 да 46 гадоў і змяшчае, у прыватнасці, пытанні аб валоданні навыкамі карыстання агнястрэльнай зброяй, выбуховымі рэчывамі, ядзернымі, біялагічнымі і хімічнымі тэхналогіямі, аб праходжанні вайсковай службы, аб удзеле ў ваенных канфліктах.

Новаўвядзенне з'яўляецца часткай маштабнай праграмы па папярэджанні ўезду на тэрыторыю краіны тэрарыстычных элементаў, якая ўведзена ў ЗША пасля падзей 11 верасня мінулага года.

Патрабаванне запаўнення дадатковай формы не распаўсюджваецца на беларускіх грамадзян, якія з'яўляюцца супрацоўнікамі замежных устаноў Рэспублікі Беларусь у ЗША, і членаў іх сямей, а таксама працуючых у міжнародных арганізацыях, што знаходзяцца ў ЗША.

### НОВЫЯ СТАВКІ КОНСУЛЬСКІХ СБОРОЎ ЗА ВІЗЫ НА ВЪЕЗД В ФИНЛЯНДИЮ

***Посольство Финляндии в Вильнюсе, аккредитованное по совместительству на Республику Беларусь, уведомило МИД Беларуси о введении с 02.02.2002 года следующих новых ставок консульских сборов за визы на въезд в Финляндию.***

Транзитная (в т. ч. выдаваемая в аэропорту) — 8.75; гостевая, деловая, туристическая (на срок пребывания до 30 дней) — 22; гостевая, деловая, туристическая (на срок пребывания от 31 до 90 дней) и однократная — 26,25; двукратная — 30,75; многократная виза на 1 год — 43,75.

За перенос визы в новый паспорт (туристический документ) взимается сбор в размере 15 долларов США.

### ЗМЕНЫ Ў ПАРАДКУ ВЫЕЗДУ ГРАМАДЗЯН З ТУРКМЕНІСТАНА

***Па інфармацыі пасольства Туркменістана ў Беларусі, 23 снежня 2001 года прэзідэнтам Туркменістана Сапармурадам Ніязавым быў падпісаны Указ "Аб удасканаленні парадку выезду грамадзян з Туркменістана".***

Адпаведна пунктам 1—3 Указа, з 1 студзеня 2002 года дазваляецца выезд грамадзян з Туркменістана ў іншыя дзяржавы без афармлення віз на выезд.

Пунктам 2 вызначана, што пры выездзе з Туркменістана для перасячэння дзяржаўнай мяжы Туркменістана неабходна наяўнасць толькі ўязной візы замежнай дзяржавы, куды непасрэдна ўязджае грамадзянін, калі іншы парадак не вызначаны міжнароднымі дагаворамі (бязвізавы ці іншы спрошчаны парадак). У асобных выпадках, у адпаведнасці з заканадаўствам Туркменістана і міжнароднымі дагаворамі, перасячэнне дзяржаўнай мяжы пры выездзе з Туркменістана дазваляецца пры наяўнасці афармленых у адпаведным парадку дакументаў, якія пацвярджаюць магчымасць атрымання ўязной візы замежнай дзяржавы, на тэрыторыю якой непасрэдна выязджае грамадзянін.

Заканадаўствам Туркменістана могуць быць вызначаны часовыя абмежаванні права асобных грамадзян на выезд з Туркменістана, якія звязаны з дасведчанасцю ў дзяржаўных сакрэтах, узбуджэннем супраць грамадзяніна крымінальнай справы, асуджэннем за ўчыненае злачынства, прад'яўленнем грамадзянскага іску ў судзе, адхіленнем ад абавязацельстваў, якія былі накладзены судом, прызывам на абавязковую вайсковую службу, паведамленнем аб сабе заведама недакладных звестак.

Прэс-служба МЗС.

*надзённа*

# МУЗЕІ РЫХТУЮЦЦА ДА ЮБІЛЕЯЎ ПЕСНЯРОЎ

Пачатак на 1-й стар.

**Жанна ДАПКЮНАС, дырэктар літаратурнага музея Янкі Купалы:**

— Музейная экспазіцыя, якую мы зараз маем, увесь час дапаўняецца і абнаўляецца, але да юбілею Янкі Купалы яна будзе пададзена ў часткова абноўленым мастацкім аздабленні, над чым працуе вядомы беларускі мастак Эдуард Агуновіч.

У нашых чатырох філіялах: у Вязынцы, Яхімаўшчыне, Ляўках і Акопах — у час юбілею плануем правесці шэраг імпрэз. Але якраз у філіялах мы маем найбольш гаспадарчых праблем. Трэба перакрыць гонтам мемарыяльную дачу Янкі Купалы ў Ляўках, устанавіць мемарыяльны знак ў Селішчах. З купалаўскіх мясцін паблізу ёсць яшчэ Бараўцы, Дольны Сноў, Беліца і іншыя. Хацелася б пазначыць гэтыя мясціны ўстаноўкай памятных знакаў-валуноў з надпісамі.

Не так даўно ў Акопах Лагойскага раёна створаны Купалаўскі заказнік. Паэт у Акопах працаваў вельмі натхнёна. Тут былі напісаны знакамітыя "Паўлінка" і "Тутэйшыя", мноства вершаў і паэм. У нас цікавыя выдавецкія планы. Мяркуем выдаць альбом-буклет "Па купалаўскіх мясцінах". Вельмі цікавай з'явай будзе выпуск зборніка "Санеты" Янкі Купалы на васьмі еўрапейскіх мовах. Многія, пэўна, не ведаюць, што першы вопыт складання вершаў у гэтым літаратурным жанры ў Беларусі належыць менавіта яму.

Бадай, галоўным мерапрыемствам для нас будзе рэспубліканскае свята паэзіі "Купалле" ў Вязынцы Маладзечанскага раёна ў ліпені. Мы ўжо маем вялікі вопыт яго штогадовага правядзення сумесна з Саюзам беларускіх пісьменнікаў. Для жыхароў Мінска і замежных гасцей будзе праведзены ўрачысты вечар у будынку Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Далей мы плануем некалькі акцый за межамі нашай краіны — у Кіеве, Вільнюсе і, можа стацца, у Лондане. Мы маем добрыя сувязі з музеем Дзікенса. Не так даўно ў нас экспанавалася выстава, прысвечаная гэтаму пісьменніку, а зараз настае час пазнаёміць з творчасцю Янкі Купалы аматараў літаратуры ў Англіі. У сувязі з гэтым наш музей распрацоўвае канцэпцыю і тэматычны план выставы ў плакатах. Не выключаем, што пасля выдання плакатаў выстава будзе даслана ў беларускія прадстаўніцтвы многіх краін свету.

З прыемнасцю паведамлю, што прынята рашэнне аб узвядзенні помніка Янку Купалу ў Маскве. Выканаўцам кампазіцыі будзе беларускі скульптар Валяр'ян Янушкевіч. У той жа час плануецца адкрыць помнік Якубу Коласу ў Санкт-Пецярбургу, пра што вядуцца перамовы з расійскім бокам.

Увогуле, мы рыхтуемся і чакаем на юбілей гасцей з розных куткоў свету. Побач з нашым музеем растуць явар і каліна, што пасадзілі беларусы з Польшчы і Амерыкі — Алесь Баршчэўскі і Янка Запруднік. Можа пасля 120-гадовага юбілею Янкі Купалы тут з'явяцца новыя дрэўцы як сведчанне памяці беларусаў замежжа пра сваю Радзіму.

**Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, дырэктар мемарыяльнага музея Якуба Коласа:**

— Наша галоўная задача ў юбілейным годзе — абнаўленне экспазіцыі музея. Адрозніваецца ад мінулай яна будзе тым, што мы пакажам жыццё Коласа на аснове яго твораў, у многім біяграфічных, такіх, як "Новая зямля", "Сымон-музыка", трылогіі "На ростанях" і іншых.

У асноўным да нас прыходзяць на экскурсіі навучэнцы беларускіх школ згодна з вучэбнай праграмай, але мы хочам, каб у музей часцей заходзілі турысты, што прыязджаюць у Мінск.

Акрамя таго, маем вялікую задачу — добраўпарадкаваць сялібы нашых філіялаў Альбуць, Ласток, Акінчыцы і Смольня ў Стаўбцоўскім раёне і іншыя мясціны, што звязаны з імем Якуба Коласа. Асаблівы клопат маем пра дом у Пінску, дзе ў 1912—1915 гадах жыў Якуб Колас, а зараз — некалькі сем'яў пінчукоў. Патрабуецца іх адсяліць, а дом ператварыць у музей.

Вельмі цікавая старонка ў жыцці Якуба Коласа звязана з Пухаўшчынай, дзе ён працаваў і кватараваў у розных мястэчках. Многа сваіх твораў пясняр прысвяціў менавіта гэтай зямлі. Цяпер у Пухавіцкім раёне неабходна многае зрабіць, каб захаваць памяць пра паэта.

Амаль штотыднёва ў музеі мы праводзім тэматычныя вечарыны і сустрэчы. Плануем Міжнародную канферэнцыю "Каласавіны", у якой прымуць удзел навукоўцы з розных краін свету. Мяркуем правесці імпрэзы за межамі нашай краіны — у Прыбалтыцы і Польшчы. У верасні і лістападзе наш музей абавязкова прыме ўдзел у Рэспубліканскім свяце паэзіі ў Коласаўскім мемарыяльным заказніку ў Стаўбцоўскім раёне і ў арганізацыі Рэспубліканскага вечара і святочнага канцэрта, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння нашых песняроў.

Да гэтага часу будзе выдадзены зборнік твораў Якуба Коласа. Асобна — "Лірыка Якуба Коласа" і сувенірны варыянт паэмы "Новая зямля" на беларускай, рускай і польскай мовах. Будуць выпушчаны кніжкі-малюткі, календары і буклеты юбілейнай тэматыкі. У нас будзе чым сустрэць гасцей, якія збяруцца на юбілей.

Гутарыў **Віктар МАЦЮШЭНКА.**

***Беларускім суполкам газета "Голас Радзімы" паведамляе, што планам юбілейных мерапрыемстваў з дапамогай музеяў прадугледжваецца распаўсюдзіць за межамі Беларусі праз пасольствы перасоўныя фотавыставы, а ў першым паўгоддзі 2002 года ў Інтэрнэце будзе змешчана старонка з інфармацыяй аб жыцці і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.***

***Акрамя таго, "Белвідэацэнтр" ужо распачаў работу па стварэнні відэафільмаў аб музеях Янкі Купалы і Якуба Коласа і іх філіялах.***

*спорт*

**ФУТБОЛ.** Адбылася жараб'ёўка першынства Еўропы, фінал якога пройдзе ў Партугаліі. Зборная Беларусі ў папярэдніх гульнях сустрэнецца з камандамі Чэхіі, Галандыі, Аўстрыі і Малдовы.

**БАСКЕТБОЛ.** У адборачнай гульні першынства Еўропы каманда Беларусі перамагла папякаў з лікам 78:67.

**ГАНДБОЛ.** Мужчынская зборная Беларусі ў апошняй сустрэчы кваліфікацыйнага турніру чэмпіянату свету выйграла ў каманды Літвы і заняла другое месца ў сваёй групе.

**БІЯТЛОН.** Капітан беларускіх алімпійцаў Алег Рыжанкоў у гонцы на 20 кіламетраў заняў шостае месца на розыгрышы Кубка свету ў Італіі.

**Іван ТУРАЎ.**

***Пераможца першынства свету па скачках на батуце ў Данії — віцяблянка Алена ТАРАСЕВІЧ.***

Фота **Аляксандра ХІТРОВА**, БелТА.

*ракурс*

# ГАЛОЎНАЕ — ЧУЛЛІВЫ НОС

***Звычайна пасажыраў з сабакамі ў метро не пускаюць. Але ўсё ж "братоў нашых меншых", асабліва невялікіх памераў, дазваляецца перавозіць у сумках, рукзаках або проста за пазухай. Таму зразумелае здзіўленне людзей, якія назіралі, як вялізная ўсходнееўрапейская аўчарка, ды яшчэ без наморднika, спакойна ходзіць побач з гаспадаром па перону Мінскага метрапалітэна. Цікава, чаму гэтаму сабаку зрабілі выключэнне і да чаго ён у падземцы так пільна прынюхваецца? Тлумачэнне даў намеснік старшыні АУС па ахове Мінскага метрапалітэна падпалкоўнік Анатоль ШУЛІНСКІ.***

— Лабрадоры і аўчаркі — незаменныя памочнікі падчас пошукаў. Іх з поспехам выкарыстоўваюць для выяўлення выбуховых рэчываў. Чатырохногія сябры спраўна нясуць службу ў метрапалітэнах многіх гарадоў. Да іх даўно прывыклі пасажыры маскоўскага і піцерскага метро. Але, у параўнанні з Масквой, дзе служыць больш за дзесяць сабак, у нас у штаце пакуль адзін. Аўчарка Рада, як кажуць, "першая пастаўка" і вялікая надзея. Пакуль яна праходзіць, гаворачы па-ваеннаму, курс "маладога байца". Потым яе чакаюць штодзённыя працоўныя будні без свят і выхадных.

Праца пад зямлёй — справа цяжкая. Напрыклад, мала навучыць сабаку знаходзіць выбуховае рэчыва, трэба яшчэ і выпрацаваць у яе трывалую звычку поўнага спакою. Яна павінна толькі адчуць небяспечны пах і, не датыкаючыся да падазронага прадмета, ахоўваць яго да наступнай каманды гаспадара.

Дык няхай нашай Радзе спрыяе лёс. А пасажыры няхай не пужаюцца, убачыўшы аўчарку без наморднika: яна аберагае іх ад небяспекі.

**Зінаіда МІШУРА.**

*гасцёўня*

# ЯК «РАДЗІМІЧЫ» «ЗАВАЯВАЛІ» КАРЭЮ

***На адрас Мінскага завода колавых цягачоў і Міністэрства культуры Беларусі прыйшло пісьмо-падзяка ад пасла Беларусі ў Рэспубліцы Карэя А. Сямашкі, дзе гаворыцца: "Паведамляем, што беларускі ансамбль "Радзімічы" паспяхова прыняў удзел у Міжнародным фестывалі "Пунгмуль", на якім заняў першае месца, і ў Міжнародным фальклорным фестывалі, які праводзіўся пад эгідай Сусветнай асацыяцыі недзяржаўных арганізацый і пры садзейнічанні ЮНЕСКА". Для самадзейнага калектыву — гэта вельмі высокая ацэнка.***

***Я сустрэлася з кіраўніком ансамбля Уладзімірам ЛІПСКІМ і яго жонкай Франчэскай, першай памочніцай і вельмі абаяльнай, энергічнай жанчынай — душой і ўпрыгажэннем калектыву. Некалькі разоў мне давялося слухаць, як яна спявае чыстым моцным сапрана пад акампанемент баяна Уладзіміра. І кожны раз шкадавала, што па тэлевізары, на жаль, рэдка пачуеш такія задушэўныя спевы. Размова, зразумела, пачалася з ўражанняў, якія пакінула Карэя.***

**Уладзімір:** Амаль цэлы месяц мы гастралявалі ў Паўднёвай Карэі. Прыём быў на высокім узроўні. Мы не толькі прынялі ўдзел у фестывалі і конкурсе, але і далі некалькі канцэртаў. Да таго ж, нам прапанавалі ўдзельнічаць у наступным конкурсе, які адбудзецца ў красавіку 2002 года, запрасілі на адкрыццё Чэмпіянату свету па футболу, які пройдзе ў Карэі, і яшчэ было шмат прапаноў...

*— Цікава, нашы культуры, менталітэт такія розныя. Не сакрэт, што нацыянальныя песні і спевы не заўсёды зразумелыя іншым народам. Нам, беларусам, складана ўспрымаць карэйскую музыку. Як гэта вам удалося так спадабацца карэйскай публіцы?*

**Франчэска:** Мы выступалі ў Сеульскім тэатры нацыянальных культур. Тут было свята песні, дзе розныя карэйскія калектывы выконвалі па адной песні. У пэўны момант нам падалося, што зала засумавала. Нас нават арганізатары папярэдзілі, каб на сцэну з інструментамі падняліся вельмі хутка. Калі ж мы запелі, у зале падняўся гул адабрэння, а потым аўдыторыя ўзарвалася апладысментамі. Тое ж было, і калі выступалі ва універсітэце. Нашы лірычныя песні, наша музыка ўсім вельмі падабаліся.

**У.:** Карэйскае тэлебачанне зрабіла фільм пра нас, які доўжыцца цэлую гадзіну. Плануюць зрабіць яшчэ адзін, але хочуць здымаць ужо ў Беларусі. Фатографы нас дапякалі, нібы інапланецян.

*— Што цікавага вы ўбачылі ў Карэі? Што больш за ўсё ўразіла?*

**У.:** Паўднёвакарэйцы вельмі замкнутыя для свету. У іх усё толькі сваё: машыны, тэхніка, аўтобусы (як нам казалі, іх налічваецца каля 50 мадэлей). На пляцоўцы стаіць каля 1 000 аўтамашын, і не знойдзеш дзвюх аднолькавых. Кожныя паўгода выпускаюць новую мадэль. Праз пяць гадоў машыну мяняюць, бо за 1—2 зарплаты карэец у стане купіць новую.

*(Зразумела, мужчын у першую чаргу цікавяць аўтамабілі, пра іх яны могуць гаварыць бясконца. Да размовы падключаецца Франчэска).*

**Ф.:** Карэйцы, нягледзячы на тое, што па многіх паказчыках апярэдзілі еўрапейцаў, засталіся наіўнымі, шчырымі. Выступаць перад імі вельмі прыемна, бо яны непасрэдна рэагуюць, не хаваюць сваіх эмоцый.

*— Дзе вам даводзілася выступаць яшчэ?*

**У.:** Выступалі і ў Еўропе, і ў ЗША. Дарэчы, мы павінны былі летам ехаць на фестываль фальклорных калектываў у Канаду, вы аб гэтым нават паведамлялі ў сваёй газеце, але ў апошні момант усё сарвалася. Канадскія чыноўнікі адмовілі нам у візе.

*— Мінулы год быў насычаны гастролямі, чым вы займаецеся цяпер?*

**У.:** Працуем над рэпертуарам. Хочам яго пашырыць: дабавіць класіку, эстрадныя песні. Напрыклад, у Карэі рызыкнулі выканаць "Турэцкі марш" Моцарта на баяне і беларускіх нацыянальных інструментах — ксілафоне і цымбалах. Прайшло "на ўра".

*— Хто пяе і іграе ў ансамблі?*

**У.:** Ансамблю амаль 22 гады. Узнік ён як самадзейны калектыў аднаго з падраздзяленняў Мінскага аўтамабільнага завода, потым гэта падраздзяленне пераўтварылася ў завод колавых цягачоў.

У калектыве ёсць і прафесійныя артысты, і аматары. Музыканты ўсё ж такі павінны добра іграць, таму мы запрашаем тых, хто скончыў кансерваторыю альбо музычнае вучылішча. Ёсць некалькі чалавек з завода. Але прадпрыемства сёння не мае сродкаў, каб падтрымліваць самадзейнасць, таму можна сказаць, што калектыў цяпер прыватны, сямейны. Прыходзіцца "круціцца", каб зарабіць на інструменты, касцюмы, на паездкі і іншае.

*— Але ж вы бясплатна робіце рэкламу заводу...*

**Ф.:** У Карэі выйшаў часопіс з вялікім артыкулам пра Беларусь. Сярод іншага быў здымак нашага калектыву і расказ пра завод колавых цягачоў, да якога мы адносімся. Былі здымкі і машын, што выпускае завод.

*— Цікава даведаца, як і калі вас звёў лёс?*

**Ф.:** Песня і звяла. Я спявала ў народным хоры МАЗа, а Уладзімір, тады яшчэ студэнт інстытута культуры, арганізаваў хор у адным з падраздзяленняў завода. У Палацы культуры і сустрэліся. Ёсць дзве дачкі. Старэйшая Таццяна таксама ў "Радзімічах". Цяпер мы з ёю спяваем дуэтам: нядрэнна атрымліваецца, бо ў нас тэмбры падобныя. Таццяна іграе на фартэпіяна і працягвае вучобу ў інстытуце культуры.

*— А калі вы пачалі спяваць?*

**Ф.:** Яшчэ ў дзяцінстве. Вельмі любіла песні ў выкананні Людмілы Зыкінай. Спявала на школьнай сцэне, любіла спяваць у полі, дзе ніхто не перашкаджаў. З раніцы ўстаю і спяваю, мне нават мама гаварыла: калі ты ўжо супакоішся? Для бацькоў маё захапленне спевамі было несур'ёзным. Яны настаялі, каб паступіла ў тэхнікум. І хоць спецыяльнасць у мяне аказалася цікавая — тэхнік па халадзільных устаноўках, усё ж без спеваў я не змагла. Пайшла ў самадзейнасць, затым скончыла Мінскае вучылішча мастацтваў.

**У.:** Гармонік трапіў да мяне ў пяць гадоў. А ўжо ў шэсць вясковыя хлопцы "выкрадалі" мяне з дому, каб іграў на танцах. Сам я са шматдзетнай сям'і. Бацька з вайны вярнуўся інвалідам: 5 раненняў і 3 кантузіі. Давялося з дзяцінства шмат працаваць у лясгасе. Прыбавілі мне трохі гадоў і працаваў з бензапілой. Так што не было магчымасці вучыцца ў музычных школах. Але мары сваёй не здрадзіў. Чатыры разы паступаў у музычнае вучылішча, мяне не хацелі браць, бо я нотнай граматы не ведаў. Толькі на чацвёрты раз узялі, ацанілі ўпартасць. Вучыўся лёгка і замест трох год закончыў вучылішча за два, перагнаўшы сваіх аднакурснікаў. Потым закончыў інстытут культуры і ўвесь гэты час працую з самадзейнымі калектывамі.

*— Дзякуй за гутарку, няхай ваша творчасць і надалей нясе радасць людзям. Поспехаў "Радзімічам" у новых конкурсах і фестывалях!*

Гутарыла **Таццяна КУВАРЫНА.**

На здымку Франчэска (злева), Уладзімір і Таццяна ЛІПСКІЯ.

*спадчына*

## ОРША Ў ЛЮСТЭРКУ ГІСТОРЫІ

***Да ўгодкаў надання Оршы магдэбургскага права (13.XII. 1620 года) аддзел культуры Аршанскага гарвыканкама і Музейны комплекс "Гісторыя і культура Аршаншчыны" 19 снежня 2001 года правялі чарговую, 10-ю навукова-краязнаўчую канферэнцыю "Орша: гісторыя і культура ў люстэрку сучаснасці".***

Адкрыла яе загадчык аддзела культуры гарвыканкама Ірына Мігаль. З паведамленнямі выступілі краязнаўцы, музейныя супрацоўнікі, работнікі занальнага Дзяржаўнага архіва ў Оршы, настаўнікі школ горада і раёна.

Як паказала канферэнцыя, на працягу апошняга дзесяцігоддзя ў рэгіёне ўмацаваўся дзейсны навуковы калектыў са складу музейных супрацоўнікаў, гісторыкаў і краязнаўцаў, якія займаюцца вывучэннем, раскрыццём і папулярызацыяй невядомых ці малавядомых старонак матэрыяльнай і духоўнай культуры роднага краю.

З поўным зместам матэрыялаў канферэнцыі можна азнаёміцца ў зборніку, які плануецца выдаць у бліжэйшы час, і на старонках мясцовай "Аршанскай газеты".

**Уладзімір КУЗУБАЎ.**

*жыццёвыя сюжэты*

## ПЕРАПЫНЕНАЕ НАВЕДАННЕ

***13 студзеня 2002 года. Нядзелька. Стары Новы год. Дзесь а гадзіне дзесятай раніцы патэлефанаваў Анатоль Каляда і паведаміў сумную вестку: памёр Яўген Кулік.***

*Яўген КУЛІК.*

Вестка пра смерць заўсёды нечаканая. Яна бянтэжыць кожнага. А тут памёр чалавек, блізкі табе духоўна. Да ўсяго і твой аднагодак. Сёлета Яўгену было б шэсцьдзесят пяць. Нарадзіўся ён у 1937-м. Якраз у тым годзе, калі вар'яцкая ідэалогія касіла пад корань цвет нацыі. І ён гэтую касавіцу адчуваў кожнага дня на працягу ўсяго жыцця і рабіў усё, каб вярнуць памяць пра бязвінна знішчаных.

І вось ужо смерць-ліхадзейка замахнулася і на Яўгенаву душу. Цэлы дзень я хадзіў прыгнечаны. Гэта ж і я з 1937 года. Пані з касою дзесь паглядае ўжо і ў мой бок. Але, хвала Богу, ногі мяне пакуль носяць спраўна! Сёння носяць, а заўтра невядома што будзе... Трэба з кімсьці падзяліцца гэтай сумнай весткай. Але не хацелася, гледзячы на белы дзень, хоць каго засмучаць. Падумалася: "Хай пакуль кожны спакойна займаецца сваімі надзённымі клопатамі." І толькі надвечар, трохі асэнсаваўшы, што здарылася, патэлефанаваў Генадзю Тумашу. Слухаўку ўзяла гаспадыня. Пачуўшы мой голас, яна заспяшалася:

— Генадзь ужо ў дзвярах. Зараз выходзіць з дому, то я яму перадаю трубку.

— І куды ж ты, даражэнькі, выправіўся? — пытаюся я.

— А да Куліка! У Бараўляны. Каб яшчэ якой паўхвілінкі, дык ты б мяне і не застаў.

На імгненне я сумеўся: "Што сказаць? Як сказаць?"

— Забіраць? — пытаюся.

Няцяжка здагадацца, што я меў на ўвазе пад словам "забіраць". Генадзь жа зразумеў гэта, як належыць.

— Дык не, — кажа. — Ён яшчэ будзе лекавацца. А я еду яго наведаць. От мы тут з жоначкай напяклі яму духмяных дранічкаў, смятанкі да іх вязу, соку сын перадаў...

— Генадзь! — кажу я. — Мне раніцай патэлефанавалі, што Яўген памёр!

— Не можа быць!.. Я колькі дзён таму быў у яго! — разгублена, панікла азваўся Генадзь. — А хто тэлефанаваў? Хто сказаў?

— Анатоль Каляда, фатограф.

— А ён ад каго пачуў?

— Ад Крукоўскага! Нібыта ён пытаўся, ці можа Анатоль зрабіць добры для жалобы здымак.

Кажу я гэта Генадзю, а сам пачынаю сумнявацца: "Калі Генадзь, досыць блізкі да Яўгена чалавек, нічога пакуль не ведае пра згон прыяцеля, то можа гэта ўсё няпраўда?"

— Калі вялі гаворку пра фота, — гаворыць Генадзь, — значыць, праўда! А я ж узяў і магнітную стужачку з запісамі ўнучкаў, з беларускімі вершамі. Хацеў пацешыць Яўгена шчырымі дзіцячымі галаскамі. Яму гэта падабалася... І от ты тэлефануеш... А ён жа ўсё казаў: "У мяне гэтулькі задумаў, гэтулькі працы. Каб толькі архіў уладкаваць, мне патрэбна два гады..."

На жаль, Бог не даў яму гэтых двух гадкоў, адлучыў ягоную душу ад цела. І от мы з Генадзем Тумашам, які яшчэ колькі хвілінаў таму думаў пра Яўгена як пра жывога, вёз яму дранічкі, мусім згадваць пасля пэўнага шоку, якім быў Яўген.

То які ён быў? Няўрымслівы. Непадкупны. Працавіты. Сумленны. Бескампрамісны. Інтарэсы Беларусі, нацыянальнай нашай культуры былі для яго найвышэй за ўсё. За гэта яго паважалі, гарнуліся да яго. Мастак пакінуў Беларусі вялікую мастацкую спадчыну. Ён меў свой адметны мастакоўскі почырк, стыль, ілюстраваў шматлікія кнігі. Рэканструяваў старажытныя беларускія замкі. Усяго і не згадаеш, што зрабіў Яўген Купік для свае Бацькаўшчыны. Ён пакінуў пра сябе прыкметны след на нашай святой зямлі!

...Мінула ўжо колькі дзён, як Беларусь развіталася з сваім самабытным мастаком. А з маёй галавы ўсё не выходзіць той званок да Тумаша 13-га студзеня. Гэта ж трэба было мне патэлефанаваць да яго якраз у той момант, калі Генадзь збіраўся ехаць у Бараўляны, каб праведаць хворага мастака. Нейкая ж сіла кіравала мною, каб менавіта ў гэты момант, а не ў нейкі іншы я падышоў да тэлефона. Генадзь Тумаш лічыць гэты факт знакавым. За ім штось тоіцца. Але што? Выпадковасць ці якаясь звышінтуіцыя, пасланая з неба? Што ні кажыце, а шмат яшчэ чаго загадкавага на нашым белым свеце.

**Уладзімір СОДАЛЬ.**

*каляндар-2002: люты*

* * *

***24 лютага ў вёсцы Кацёлкі на Пружаншчыне нарадзіўся Іван ХВОРАСТ (памёр 1 ліпеня 1983 года), танцоўшчык, балетмайстар, збіральнік беларускага харэаграфічнага фальклору, заслужаны работнік культуры Беларусі.***

Творчую дзейнасць пачаў у 1928 годзе як саліст танцавальнай групы хору Славянскай песні Віленскай беларускай гімназіі, у 1940—1950 гадах быў кіраўніком харэаграфічнай групы Беларускага ансамбля песні і танца (пад кіраўніцтвам Р. Шырмы). У 1953—1960-х — саліст Белдзяржфілармоніі, у 1960—1978-х — кансультант Рэспубліканскага Дома народнай творчасці, аказваў дзейсную дапамогу самадзейным харэаграфічным калектывам Беларусі.

* * *

***29 лютага ў маёнтку Крынкі 130 год таму назад нарадзіўся Вітольд БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ (памёр 18 чэрвеня 1957 года), жывапісец-пейзажыст, народны мастак Беларусі і РСФСР, ганаровы акадэмік НАН Беларусі.***

Вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства (1889—1896 гады) у С. Каровіна, М. Неўрава, І. Пранішнікава, В. Паленава. Зазнаў уплыў І. Левітана. Быў членам Таварыства перасоўных выстаў, Таварыства імя А. Куінджы. У савецкі перыяд значнае месца ў яго творчасці займалі пейзажы мясцін, дзе бывалі А. Пушкін, Л. Талстой, а таксама пейзажы Беларусі. У гарадскім пасёлку Бялынічы адкрыты Бялыніцкі мастацкі музей імя В. Бялыніцкага-Бірулі, у Магілёве — Мастацкі музей В. Бялыніцкага-Бірулі.

Падрыхтавала **Ларыса КАРАЧУН.**

*хрысціянская старонка «ЖЫЦЦЁ і ВЕРА»*

# ГАДЫШЭЎСКАЯ ІКОНА БОЖАЙ МАЦІ

***Святкаванне іконы прыпадае на пачатак новага года. Гэтыя дні самыя ўлюбёныя ў дарослых і дзетак, дні сямейнай еднасці і шчаслівай гармоніі, калі душы дарослых спадабняюцца дзіцячым, а дзіцячыя — ангельскаму стану. У такі цудадзейны час бацькі просяць розных дабротаў для дзетак, а найперш, мудрасці, розуму, прагі да ведаў зямных і нябесных.***

Асаблівасць іканаграфічнага канона святыні ў спалучэнні элементаў ікон "Замілаванне", "Прамудрасці Божыяй" і "Усецарыцы". Багародзіца і Дзіцятка Ісус маюць царскія вянцы на галовах, Гасподзь благаслаўляе правою рукою, а ў левай трымае дзяржаву ці кнігу!

Святыня роднасная іканаграфічнаму тыпу Чанстахоўскай, Краснастоцкай, Яблачынска-Турковіцкай Адзігітрый. Паводле народнага падання, цудадзейная ікона была ўяўлена на ліпавым дрэве ў лесе. З малебнам яе перанеслі ў каплічку вёскі Кяўлакі Гродзенскай вобласці. Але неўзабаве ікона з'яўляецца нанава на тым жа месцы. Тады вернікі адчулі, што Прачыстая жадае, каб там быў пабудаваны храм у Яе гонар. У лістрацыі 1562 года, паводле каралеўскай граматы і роспісу гетманскіх актаў горада Бранска, сустракаецца першае ўпамінанне пра святыню. Пасля падзелу Польшчы ў 1795 годзе Бранск з вакольцамі перайшоў пад уладу прускага караля. Але, нягледзячы на жаданне прускіх чыноўнікаў, храм не быў закрыты. У 1881 годзе каменны храм асвячоны архіепіскапам Холмска-Варшаўскім Лявонцієм, прыняў вернікаў, праз 3 гады пры саборы будуецца каплічка.

Захавалася асноўная святыня храма — цудадзейная ікона Багародзіцы з Дзіцяткам Хрыстом на руках. Ікона ўпрыгожана залачонаю шатаю, каранавана залачоным вянцом з шасцю зорамі, дыяментамі і рубінамі. Над галавою Дзіцяткі Хрыста — сярэбраны вянец з пасярэбраным сэрцам. Ікона знаходзіцца ў залачонай раме, у нізе якой выгравіраваны залачоны надпіс: "Пад Тваю літасць прыбягаем, Багародзіца Дзева".

Да цудадзейнай іконы спрадвеку звярталіся шматлікія вернікі са сваімі пакутамі і хваробамі, таму святыня ўпрыгожана дарамі тых багамольцаў, якія атрымалі дапамогу ад Гадышэўскай Адзігітрыі. Літаральна ўся ікона ўвешана залачонымі і сярэбранымі вотамі ў выглядзе сэрцаў, рук, ног, вачэй, з надпісамі, кім яны ахвяраваны, і з пачатковымі літарамі імя Прасвятой Багародзіцы. Многія падарункі ўпрыгожаны перлінамі. Цудадзейнай іконе ахвяраваны дыяментавы крыж з 9 камянямі, залаты медальён з надпісам "Ад усялякіх няшчасцяў і хвароб абарані нас, Госпадзі", медальён-чырвонец з надпісам "Францішак II, імператар Аўстрыйскі, 1806", сярэбраныя медальёны, крыжыкі, залатыя, сярэбраныя, бронзавыя пярсцёнкі, бранзалеты, каралі, карункі, нават французскія ўзнагароды часоў Напалеона I. Ікона раней знаходзілася ў алтары, зараз — у іканастасе.

*Гадышэўская царква яшчэ мае наступныя гістарычныя рэліквіі: званы з надпісамі: "Хваліце Госпада, усе народы" (1675), "Антоній" (1749), "Пяю Госпаду майму, пакуль існую" ("дандеже есмь"). Храмавая бібліятэка мае два Служэбнікі віленскага друку 1692 г., супрасльскага 1726, 1727, 1758, 1763 гг. Кнігу ўшанаванняў пачаеўскага друку 1763 г., Евангелле на Страстную Сядміцу, Мінеі Месячныя ў 6-ці кнігах за 1761 г., Трыёдзь Посную, Каляровую, Ірмалой, Часаслоў і святочныя мінеі.*

Падрыхтавала **Алена ЯСКЕВІЧ.**

# НОВЫ ПАСОЛ ВАТЫКАНА НАВЕДАЎ ВІЦЕБСК

***Новы Апостальскі Нунцый у Беларусі архіепіскап Іван Юрковіч наведаў з азнаямленчым візітам Віцебскую рымска-каталіцкую дыяцэзію (епархію).***

Па словах епіскапа Віцебскай дыяцэзіі Уладыслава Бліна, пасол Ватыкана ў Полацкім касцёле правёў рабочую сустрэчу са святарамі і манаствам.

У. Блін адзначыў, што Віцебская каталіцкая дыяцэзія — самая малодая ў Беларусі. Яна існуе ўсяго каля двух гадоў. Цяпер на тэрыторыі Віцебскай вобласці дзейнічае 81 прыход Рымска-каталіцкай царквы.

У. Блін станоўча ацаніў вопыт супрацоўніцтва з мясцовымі ўладамі і асабліва адзначыў "добрыя адносіны з мясцовай праваслаўнай епархіяй".

**Вераніка БОХАН.**

*ракурс*

# І МАНАХІ СЛУЖАЦЬ

***Пасля заканчэння харавога аддзялення Гомельскага музычнага каледжа імя Сакалоўскага Уладзіміру Ганчарову прарочылі вялікую музычную будучыню. Ён стаў салістам хору каледжа, пеўчым у хоры сабора Пятра і Паўла. Але нечакана для многіх застаўся паслушнікам у манастыры з намерам стаць манахам.***

Праз год паслушніцтва яго пасвяцілі ў іерадыяканы, а калі прыйшла павестка з ваенкамата, архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх блаславіў хлопца на службу Айчыне. Зараз Уладзімір Ганчароў у вольны час спявае ў ансамблі вайсковай часці, дзе служыць. А зусім нядаўна на конкурсе ваенна-патрыятычнай песні ў Віцебску атрымаў перамогу ў намінацыі... "Камсамол".

НА ЗДЫМКУ: манах Свята-Нікольскай царквы Уладзімір ГАНЧАРОЎ не цураецца ніякай працы.

**Сяргей ХАЛАДЗІЛІН**, БелТА.

*факт*

# АДРОДЖАНЫ ЯШЧЭ АДЗІН ХРАМ

***У вёсцы Казіміра Жлобінскага раёна, на тым самым месцы, дзе калісьці знаходзіўся Свята-Успенскі манастыр, загучалі званы нанава адбудаванага храма.***

Будаўніцтва вялося на ахвяраванні вернікаў, іншыя дабрачынныя сродкі і доўжылася два гады. Зараз Свята-Успенская царква адкрыта, там ідуць богаслужэнні.

**Пётр ЖЭБРАК.**

# КАТАЛІЦКІ КАЛЯНДАР

**6 студзеня** — Аб'яўленне Божае (Трох Каралёў)
**13 студзеня** — Хрост Езуса Хрыста
**2 лютага** — Ахвяраванне Езуса Хрыста (Грамніцы)
**13 лютага** — Папялец
**19 сакавіка** — Святога Юзафа
**31 сакавіка** — Вялікдзень
**9 траўня** — Узнясенне Езуса Хрыста
**19 траўня** — Спасланне Духа Святога
**30 траўня** — Цела і Крыві Хрыста
**29 чэрвеня** — Святых Апосталаў Пятра і Паўла
**2 ліпеня** — Маці Божай Будслаўскай
**15 жніўня** — Унебаўзяцце Найсвяцейшай Марыі Панны
**1 лістапада** — Усіх Святых
**2 лістапада** — Дзень успаміну ўсіх памерлых (Дзяды)
**24 лістапада** — Езуса Хрыста, Валадара Сусвету
**1 снежня** — 1-я нядзеля Адвэнту
**8 снежня** — Нявіннага Пачацця Найсвяцейшай Марыі Панны
**25 снежня** — Божае Нараджэнне

*асоба*

# БОЖЫ ЧАЛАВЕК З ПЕЛЯГРЫНДЫ

***Нямногія здольны ахвяраваць сваё жыццё служэнню Богу і людзям. Але Юлія Кармаза менавіта з іх ліку. Чуў я, што гэтая жанчына піша абразы, складае вершы, робіць помнікі. Чатырнаццаць яе абразоў упрыгожваюць капліцу ў вёсцы Завельцы Астравецкага раёна.***

І ўжо як легенду згадваюць людзі, як у пяцідзесятыя гады ездзіла Юлія Сямёнаўна ў Маскву дабівацца вызвалення арыштаванага святара. І вызваліла яго! Ну як не сустрэцца з такім цікавым чалавекам?

Па дарозе ў вёску Пелягрында, дзе жыве Юлія Сямёнаўна, завітаў на мясцовыя могілкі, каб паглядзець помнікі, што яна робіць. На ўскрайку могілак заўважыў рыдлёўку, хустку і вязаны жакет. А неўзабаве з'явілася іх уладальніца. Хударлявая, маленькая, з нязменнай усмешкай на твары. Яна павіталася са мной так, быццам мы знаёмыя многія гады. Яе амаль юнацкая рухомасць ніяк не стасавалася з узростам: жанчына размяняла ўжо дзевяты дзесятак гадоў. Юлія Сямёнаўна павяла мяне па могілках, паказваючы, што яна зрабіла ў памяць сваіх аднавяскоўцаў, і вельмі шкадавала пра зачыненую капліцу, дзе таксама ёсць ёю напісаныя абразы. А я глядзеў на яе і думаў: колькі ж душэўнай цеплыні, добразычлівасці і веры ў гэтай маленькай жанчыне! Відаць, менавіта пра такіх і кажуць: Божы чалавек.

НА ЗДЫМКУ: Юлія КАРМАЗА каля аднаго з помнікаў, зробленых яе рукамі.

Тэкст і фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

*коратка*

# РЭКТАР-КАРДЫНАЛ

***Па ініцыятыве кіраўніка Каталіцкай царквы ў Беларусі Казіміра Свёнтака ў горадзе над Пінай адкрыта вышэйшая духоўная семінарыя.***

Святочнае богаслужэнне ў пінскім кафедральным касцёле Прачыстай Дзевы Марыі ў гонар гэтай знамянальнай падзеі правёў сам кардынал. Ён жа прыняў сімвалічны ключ ад дырэктара фірмы "Рэнаватар", якая рэстаўрыравала будынак. Размешчана ж семінарыя на тэрыторыі францысканскага комплексу.

Нагадаем, што раней у Пінску была духоўная семінарыя, якую закрылі пасля далучэння Заходняй Беларусі да Усходняй. І гэту навучальную ўстанову, між іншым, закончыў цяперашні кіраўнік Каталіцкай царквы краіны, якога адразу ж назначылі парфіяльным вікарыем у Пружаны.

Кардынал стаў рэктарам вышэйшай духоўнай семінарыі, якая носіць імя святога Томаша Аквінскага.

**Тамара ЦІБАРОЎСКАЯ, "Р".**

*спеўнік*

З дзяцінства да слёз мне знаёма,
У вочы глядзіць пільна мне
З радзімае хаты ікона
Ў кватэры маёй на сцяне.

*Прыпеў:*

*Няма,*
*Няма даражэйшай на свеце*
*І больш цудатворнай няма.*

Маліцца на гэту ікону
Да скону мне будзе цяплей.
Бацькі і браты мае колісь
Ў яе адбіваліся шкле.

*Прыпеў.*

А зараз са мной мае дзеці
Штодзённа глядзяцца ў яе.
Святло нам з іконы той льецца
І змрочнымі быць не дае...

*Прыпеў.*

З дзяцінства да слёз мне знаёма,
У вочы глядзіць пільна мне
З радзімае хаты ікона
Ў кватэры маёй на сцяне.

*Прыпеў.*

*зваротная сувязь*

РАСІЯ

Ад усяго сэрца ўдзячная калектыву рэдакцыі газеты "Голас Радзімы" за вашы вельмі цікавыя матэрыялы пра Беларусь. Чытаю газету, як кажуць, ад вокладкі да вокладкі. Расіяне неабыякавыя да жыцця беларусаў, таму вялікі дзякуй за своечасовую дасылку газеты. Калі яе атрымліваеш, быццам глыток паветра з роднай зямлі ўдыхаеш і ўжо ў думках —дома, з нашымі туманамі, цёплым хлебам, водарам такіх родных вапошак у палях і вільготнай скібай торфу ў руках. І ўжо бачыш, як ціха, павольна нясе свае воды рака Пціч, як уздоўж берага спяваюць і шчабечуць птушкі. Якое ў нас зорнае неба! А якое гаючае паветра на маёй роднай Беларусі!

*Как тянет Родина моя!*
*Она, как звёздочка, в ночи*
*мерцает*
*И с каждым годом всё*
*сильней*
*Дорогу к дому освещает!*

*Прикосновеньем ветерка,*
*Влетевшим в дом мой*
*мотылька,*
*Раскатом грома*
*и дождем,*
*Небесным снегом и лучом,*
*Напоминает о себе моя —*
*Беларусь!*

Піша для вас само сэрца, мае дарагія!

Жадаю вам поспехаў у працы!

**Тамара ФАДЗЕЕВА,**
старшыня суполкі "Сяброўства".

г. Яраслаўль.

*асабістае*

# «БЕЛАРУСЬ – МОЙ РОДНЫ ДОМ»

***У свеце ёсць мноства краін, народаў, нацый. Думаю, што кожны чалавек так ці інакш лічыць сваёй радзімай толькі адну краіну. Для мяне гэта Беларусь.***
***Са мной могуць не пагадзіцца: нарадзіўся я не на Беларусі, значыць, не магу лічыць гэтую краіну сваёй радзімай. Разумею, што з такім выказваннем цяжка спрачацца.***
***Перш чым прадстаўляць свае погляды, я хацеў бы звярнуцца да слоў нашага сучасніка Дзмітрыя Ліхачова, які адзначаў, што, гаворачы пра чалавека, трэба спачатку расказаць пра бацькоў, пра карані таго ці іншага роду.***

Яшчэ зусім нядаўна я не ведаў, як можна растлумачыць, што Беларусь з'яўляецца для мяне маяком выратавання ў жыцці; цяпер жа я ўпэўнены, што пачуццё гэтае не абмяжоўваецца толькі патрыятызмам і любоўю. Гэта нешта больш высокае і адначасова незразумелае. Гэта касмічнае пачуццё, што перайшло да мяне ад бацькоў.

Я сапраўды жыву за межамі Беларусі, хаця і гэта да канца не так, бо пастаянна наведваю сваіх родных і блізкіх у Беларусі. Знаходзячыся ў Латвіі, не забываюся, хто я, дзе мой пачатак. Я ўсё роўна працягваю вывучаць родную мову, гісторыю і культуру. Бясплатная дапамога мне ў гэтым нядзельнай беларускай школы.

Я вельмі ганаруся, што мой дзядуля ўдзельнічаў у другой сусветнай вайне і перамог разам з савецкім народам, што ён вярнуўся дамоў і перадаў мне беларускі дух і сілу. Я свята веру: сіла, гонар і мужнасць ніколі не пакідалі беларускі народ, з дапамогай гэтых якасцей Беларусь пераможа ўсе нягоды.

Свядомасць людзей мяняецца з іх узростам. І я вельмі часта задумваюся аб тым, дзе буду жыць, працаваць, выхоўваць дзяцей.

Радзіма не можа быць дрэннай ці добрай, беднай ці багатай, прыгожай ці непрыгожай; Радзіма заўсёды застаецца Радзімай.

Для мяне такім месцам стала Беларусь...

**Алег АТРАХІМОВІЧ,**
навучэнец беларускай нядзельнай школы горада Даўгаўпілса.

*мінск, захарава, 28. дом дружбы*

# СУСТРЭЧЫ ПАРТНЁРАЎ

Беларуска-польскія сустрэчы партнёрскіх арганізацый: Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі і таварыстваў "Польшча—Усход", "Беларусь—Польшча" і "Польшча—Беларусь" сталі традыцыйнымі.

НА ЗДЫМКАХ: падчас сустрэчы ў Мінску; старшыня прэзідыума Усёпольскага праўлення таварыства "Польшча—Усход" Стэфан НАЎРОТ.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

*дзяржава і дыяспара*

# УКРАІНЦЫ ЗАМЕЖЖА І ІХ СУВЯЗЬ З БАЦЬКАЎШЧЫНАЙ

***У наш час за межамі сваёй краіны жыве каля 20 мільёнаў украінцаў. З іх 2,5 мільёна складаюць заходнюю дыяспару, а 17,5 мільёна знаходзяцца ў межах рэспублік былога СССР. У Канадзе налічваецца 1 мільён 54,3 тысячы ўкраінцаў, у ЗША — 740,8 тысячы, у Бразіліі — 350 тысяч, Аргенціне — 250 тысяч, Аўстраліі і Англіі — па 30 тысяч. Менавіта заходняй дыяспары належыць ініцыятыва ў справе захавання "ўкраінства" як самастойнай нацыі ў свеце.***

Тут яшчэ ў часы існавання СССР украінцы наладзілі нацыянальную адукацыйную сістэму, мелі свае рэлігійныя ўстановы, нават выдалі першую ў свеце ўкраінскую энцыклапедыю. Але лепшы спосаб захавання нацыянальнай ідэнтычнасці — стварэнне сваёй дзяржавы. Таму ад пачатку незалежнасці Украіны ў 1991 годзе заходняя дыяспара актыўна супрацоўнічае з кіеўскім урадам.

18—20 жніўня 2001 года, напярэдадні ўрачыстасцей з нагоды 10-годдзя незалежнасці Украіны, у Кіеве адбыўся III форум украінцаў свету. Кола праблем, што разглядаліся на форуме, можна акрэсліць трыядай: "Моладзь — будучыня Украіны"; "Мова і культура"; "Украіна і дыяспара — узаемадапамога".

На апошнім засяродзімся больш дэталёва. Прэзідэнт Украіны Леанід Кучма аднойчы выказаўся: няхай прадстаўнікі дыяспары менш нас крытыкуюць, а лепш скажуць, што яны зрабілі для Украіны. Украінцы з Захаду ацанілі гэтую заяву як зняважлівую, бо імі зроблена вельмі шмат.

З першых дзён незалежнасці Украіны суайчыннікі ў краінах Захаду намагаліся паўплываць на свае ўрады, каб тыя прыхільна ставіліся да маладой дзяржавы і прызналі яе суверэнітэт. Першай гэта зрабіла Польшча, другой — Канада, што адбылося дзякуючы вялікаму ўплыву яе ўкраінскага насельніцтва. Чацвёртай краінай у гэтым спісе стаіць Аргенціна: прэзідэнт "краіны срэбра" К. Менэм зрабіў адпаведную заяву 4 снежня, калі прыняў дэлегатаў з маніфестацыі мясцовых украінцаў. Актыўнасць праявіла і дыяспара ЗША. Ужо ў верасні 1991 года праходзілі дэманстрацыі насупраць Белага дома ў Вашынгтоне, якія патрабавалі прызнання Украіны, што і здарылася ў снежні 1991 года.

Украінцы заходніх краін не абмежаваліся роляй своеасаблівага грамадскага прадстаўніцтва сваёй гістарычнай бацькаўшчыны. Яны актыўна дапамагалі і дапамагаюць Украіне фінансава. Так, імі было абсталявана Генеральнае консульства Украіны ў Нью-Йорку і пасольства ў Канадзе. За апошнія дзесяць год дыяспарай перададзена Украіне каля 50 мільёнаў амерыканскіх долараў і 20 мільёнаў канадскіх долараў гуманітарнай дапамогі.

Нямала зроблена ў галіне адукацыі і культуры: фінансава падтрымліваецца фестываль "Червона Рута", выдзяляюцца стыпендыі для навучання ў замежжы, публікуюцца новыя падручнікі для школ. Дыяспара дапамагае ў такіх праектах, як узвядзенне помнікаў Т. Шаўчэнку ў розных гарадах Украіны ад Львова да Луганска. Асабліва падтрымліваецца спорт. Ад 1993 года на Алімпійскія гульні (летнія і зімовыя) дыяспара перадала зборнай Украіны транспарт, арандавала месцы трэніровак і пражывання на мільёны долараў.

Украінцы Захаду намагаюцца дапамагчы і суайчыннікам у рэспубліках былога СССР. Напрыклад, дыяспара ЗША дапамагла ўкраінцам Казахстана пабудаваць царкву ў Паўлаўградзе і школу ў Карагандзе.

Такім чынам, украінцы за мяжой актыўна садзейнічаюць будаўніцтву ўкраінскай дзяржавы.

**Сяргей ШАБЕЛЬЦАЎ.**

*занатоўкі даследчыка*

# ТРАГІЧНЫ ШЛЯХ ТАЛЕНТАЎ

***Беларуская зямля дала свету шмат яўрэйскіх пісьменнікаў. Да прыкладу, "з Пятровічаў, што на Мсціслаўшчыне, — піша В. Кіпель у сваёй кнізе "Беларусы ў ЗША" (1993), — паходзіць сусветна вядомы амерыканскі пісьменнік-фантаст Айзэк Азімаў". Мы ж хочам падаць звесткі яшчэ пра трох яўрэйскіх пісьменнікаў.***

**Койданавер Арон Самуіл бен Ізраіль**, вядомы літоўскі талмудыст, нарадзіўся ў Вільні ў 1614 годзе, памёр у Кракаве каля 1676 года. Бацька Койданавера, Ізраіль, жыў у Койданаве, каля Мінска, дзе знаходзілася каталіцкая семінарыя. Талмудскую ды равінскую адукацыю Койданавер атрымаў у Брэст-Літоўскім ешыбоце, спярша пад кіраўніцтвам Якава Гешэля і сына ягонага Ёшуі Гешэля. Койданавер быў равінам у Бяле (ля Брэста), адкуль ад жахаў казацкага паўстання ўцёк у Вільню, а потым у Люблін, дзе страціў сваю каштоўную бібліятэку. Былі забіты ягоныя дзве дачкі (1656). Адтуль Койданавер падаўся ў Маравію. Ён займаў равінскія пасады ў Нікольсбургу, Глогаў, Фюрце, Франкфурце-на-Майне і, урэшце, па вяртанні ў Польшчу ў Кракаве. Койданавер памёр у Хмельніку на пасяджэнні равінаў. Яму належыць звыш дзесятка талмудысцкіх твораў.

**Койданавер (Кайданавер) Цэві Гірш**, мараліст ды кабаліст, нарадзіўся ў Вільні, памёр у Франкфурце-на-Майне. Быў сынам Арона Самуіла Койданавера. Кабашу Койданавер вывучаў у Іосіфа бен Іуда з Мінска. Па лжывым даносе Койданавер разам з сям'ёю быў асуджаны, пакутаваў 4 гады ў турме. Пазней ён адправіўся ў Франкфурт, дзе ўзяўся за літаратурную дзейнасць. Выдаў творы бацькі, дадаўшы да іх заўвагі. Найбольш вядомы навучальны твор Койданавера "Правільная мера", які ўяўляў сабой перапрацоўку і дадатак да твора Іосіфа Дубны. Кніга складаецца з 102 раздзелаў, прасякнута змрочным аскетызмам, уласцівым эпосе прыгнёту польскага яўрэйства. Яна аж кішыць дэманамі ды чарцямі. "О чалавек, — ускліквае аўтар, — калі б ты ведаў, колькі д'яблаў прагне тваёй крыві, то ты падначаліўся б цалкам, і целам, і душою, Госпаду Богу". Кніга выдавалася шматразова. Аўтар зрабіў яшчэ нямецка-яўрэйскі пераклад яе, які друкаваўся часта разам з яўрэйскім арыгіналам і стаў любімым чытаннем кабет ды простых людзей.

**Берзін Юлій Саламонавіч** (1904—1942). Нарадзіўся ў горадзе Полацку, у сям'і рамесніка. У пачатку 20-х гадоў служыў у Чырвонай Арміі. Атрымаў вышэйшую юрыдычную адукацыю. Літаратурнай працай займаўся з 1926 года, уваходзіў у літаратурную суполку "Змена". У 1927 годзе ў выдавецтве "Прибой" выйшаў яго раман "Форд". Аўтар цікавых таленавітых кніжак "Конец девятого полка" (1929), "Оптимистический роман" (1930), "Накаут" (1931), "Вяртанне на Ітаку" (1934) і іншых. У 1939 годзе Асобай нарадай НКУС СССР быў асуджаны на восем гадоў пазбаўлення волі "за ўдзел у антысавецкай трацкісцкай арганізацыі". Адбываў пакаранне ў Магадане, 26 сакавіка 1942 года паўторна арыштаваны і 16 траўня асуджаны Ваенным трыбуналам войск НКУС пры Дальбудзе за "сістэматычную паражэнцкую прафашысцкую агітацыю сярод зняволеных" да расстрэлу. 11 чэрвеня 1942 года прысуд быў выкананы.

**Алесь БАРКОЎСКІ.**

г. Якуцк.

*знаходкі*

# ПАБАЧАЦЬ І НА РАДЗІМЕ

***Напрыканцы XVII стагоддзя (да 1693 года) у калегіуме езуітаў, што месціўся ў Оршы, быў створаны рукапісны зборнік, які атрымаў пазней назву "Аршанскі кодэкс".***

Па даных вядомага літаратуразнаўцы Адама Мальдзіса, які першы з айчынных вучоных даследаваў зборнік, ён уключае чатыры польскія барочныя драмы з беларускімі інтэрмедыямі, якія ставіліся ў школьных тэатрах у Полацку ("Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба"), Оршы ("Слаўная дапамога для Раміравай перамогі, учынёная анёльскімі палкамі"), Віцебску ("Містычнае вяселле прычасця Генсерыка і Трызімунда"), Навагрудку ("Містычнае прычасце ў жалю нявінных Кароля і Фрыдэрыка"). "Аршанскі кодэкс" змяшчае сем інтэрмедыйных тэкстаў, дзе адна або дзве асобы гавораць на беларускай мове. Захоўваецца зборнік у бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве (Польшча).

Музей гісторыі і культуры Оршы накіраваў у Вроцлаў ліст з просьбай прыслаць ксеракопію тытульнай старонкі "Кодэкса". У хуткім часе прыйшоў адказ. У дасланым пакеце была ксеракопія тытульнай старонкі "Аршанскага кодэкса", а таксама суправаджальны ліст, падпісаны загадчыцай Аддзела рукапісаў магістрам Вандай Сонак, у якім, дарэчы, адзначана: "Бібліятэка звычайна не выконвае ксеракопіі старых рукапісаў XVII стагоддзя, але для вас зрабілі выключэнне". З дадатку даведаліся, што рукапіс налічвае 472 старонкі памерам 19,5х15 сантыметраў, мае вокладку з запачэннем XIX стагоддзя і экслібрыс. Набыты бібліятэкай у 1955 годзе ў кнігарні Стэфана Каміньскага (г. Кракаў).

Мяркуецца, што дасланы з Польшчы дакумент зойме належнае месца ў экспазіцыі музея, прысвечанай культуры старадаўняй Оршы.

НА ЗДЫМКУ: тытульная старонка "Аршанскага кодэкса". Друкуецца ўпершыню.

**В. ПАЎЛОВІЧ.**

*асоба ў бязмежжы часу*

***Ёсць людзі, жыццё якіх становіцца легендай задоўга да таго, як яны пакінуць нашу грэшную зямлю. Гэтаму спрыяюць не толькі іх высокія маральныя якасці, жыццёвыя мэты, але і адпаведныя гістарычныя, бытавыя абставіны. Такім чалавекам стаў Сяргей Новік-Пяюн.***

***Пазнаёміцца з ім асабіста мне выпала з нагоды пісьма ў рэдакцыю часопіса "Беларуская мінуўшчына". Аўтар яго — Павел Гаўрук з пасёлка Новая Мыш, што каля Баранавічаў, цікавіўся гімнам "Адвеку мы спалі" і згадаў, як нябожчыкі бацька і маці, сваякі і аднавяскоўцы пасля рэвалюцыі спявалі яго, прасіў апублікаваць словы песні.***

***Мне падказалі звярнуцца да Новіка-Пяюна. Пазваніў яму. Сяргей Міхайлавіч узрадавана запрасіў у госці. Па дарозе да яго прыгадалася тое-сёе з жыцця гэтага пакутніка.***

*Сяргей Новік-Пяюн.*

# НЯЗГАСНЫЯ ЗОРАЧКІ ЎСПАМІНАЎ

Працуючы ўласным карэспандэнтам абласной газеты "Мінская праўда", я больш за адзінаццаць гадоў жыў у Нясвіжы.

Шмат разоў давялося бываць і ў Лявонавічах — вялікай, прыгожай вёсцы, дзе нарадзіўся Сяргей Міхайлавіч. На яе ўскраіне, каля невялікай рачулкі, стаяў драўляны дом, у якім месціліся бібліятэка і клуб. Яго яшчэ за польскім часам пабудавалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці: нарыхтоўвалі бярвенні, вазілі іх з лесу, пілавалі, клалі сцены. У сваім клубе ахвочыя да песні лявонаўцы наладжвалі рэпетыцыі, канцэрты. Клуб стаў асяродкам беларускасці, а гурток перарос у вялікі хор. У рэпертуары пераважалі беларускія песні.

Ініцыятарам усяго гэтага быў Сяргей Міхайлавіч. Польскім уладам не падабалася, што амаль на самай граніцы, у такой вялікай вёсцы, стварыўся папулярны калектыў, які аб'яднаў моладзь не толькі Лявонавічаў, але і суседніх вёсак. Моладзь была настроена супраць апалячвання. Старэйшыя лявонаўцы добрым словам успаміналі той час і кіраўніка хору С. Новіка-Пяюна. Ён аддаваў шмат часу хору, пісаў вершы, ствараў музыку да іх.

Згадваецца публікацыя ў часопісе "Беларусь". Аўтар расказаў пра гісторыю песні "Там каля млына", якая лічылася народнай. На самай справе словы і музыку напісаў Сяргей Міхайлавіч. Гэта пра яго пачуццё да дзяўчыны расказана ў творы, які спадабаўся людзям, стаў народным і па сёння гучыць па радыё.

За беларускасць, вольналюбівую паэзію, грамадскую дзейнасць Сяргея Міхайлавіча праследавалі ўлады, нарэшце кінулі ў турму, выслалі на ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Адарваны ад роднай зямлі, ён сумаваў па ёй. Тады і нарадзілася песня "Зорачкі".

*Уночы зорачкі прыветліва*
*мігцяць,*
*Быццам з неба на мяне*
*глядзяць.*
*Што чуваць, скажыце,*
*зорачкі, вы мне*
*У маёй роднай і далёкай*
*старане?..*
*І скажыце, каб не плакаў*
*ні адзін,*
*Што ў выгнанні мусіць*
*мучыцца іх сын.*
*Прыйдзе, прыйдзе да нас*
*хутка ясны май,*
*Прылячу тады, як птушка,*
*ў родны край.*

Не патрэбны быў такі чалавек польскім уладам. Не здаўся ён і гітлераўцам — яго загналі ў канцлагер у Калдычаве каля Баранавіч. Пасля вайны шмат гадоў мучыўся ў канцлагеры на Калыме.

Каля дзвярэй кватэры Сяргея Міхайлавіча мяне дагнала шустрая дзяўчынка:

— Вы да майго дзядулі?

— Калі вы ўнучка Сяргея Міхайлавіча, то да яго.

— Ён вас чакае, — і, штурхнуўшы плечуком дзверы, забегла ў пакой.

Сяргей Міхайлавіч паскардзіўся на здароўе, папрасіў прабачэння, што сустракае мяне, ляжачы ў ложку:

— Нешта зусім занядужаў. А што вы хочаце: усё ж 87 гадкоў маю.

Ён цяжка дыхаў, прыплюшчыўшы вочы. Але хутка ажывіўся, у нас пайшла даволі спраўная размова. Відаць было, што гаспадар засумаваў па новых людзях, яму хочацца пагаварыць, успомніць сваё мінулае. Зрэшты, як і ён мне, я яму таксама не быў зусім незнаёмы. Хаця асабіста мы не сустракаліся, я ведаў яго па вершах, апавяданнях землякоў. А ён ведаў мяне па публікацыях у перыёдыцы, па маіх кніжках пра Нясвіж, у якіх і пра яго было некалькі слоў. Гэта, безумоўна, і надало нашай гутарцы ажыўленасць.

Шмат чаго прыадкрыў мне Сяргей Міхайлавіч са свайго жыцця. Расказаў, як яго ў ліку шасцісот вязняў гітлераўцы прывялі на расстрэл. Куля чыркнула па патылічы.

— Вось і ямка ёсць. Я ўпаў, прыкінуўся мёртвым, тым і ўратаваўся.

Не можа забыць таго чалавека, які двойчы яго выдаў, спачатку польскім уладам, потым — нямецкім.

У сталінскім канцлагеры на Калыме Сяргей Міхайлавіч складаў вершы "ў галаве". Запамінаў іх. Паўтараў. Шліфаваў. Калі вызваліўся з таго пекла, паклаў творы на паперу.

— Паглядзіце, — падаў мне кнігу сваіх вершаў. — Толькі што з'явілася ў продажы. У ёй сабрана амаль усё, што я стварыў за свае гады. А ў той папцы, — паказаў рукой, — прыкладна дзвесце маіх вершаў, на якія напісана музыка, і ноты да песень, мае і іншых аўтараў.

Слухаў я Сяргея Міхайлавіча — і перада мной паўставалі постаці асоб, якія, здаецца, даўно належаць гісторыі. А ён гаварыў пра іх, розных па поглядах, учынках, як пра жывых.

— У Нясвіжы прысутнічаў на выступленні Булак-Булаховіча. Пра яго людзі рознае гавораць. А тады ён прыязджаў агітаваць за ўдзел у Слуцкім паўстанні. На Рыначнай плошчы, хаця і не ў базарны дзень, сабралася шмат людзей. Булак быў апрануты пад Каліноўскага: у світцы, падпяразанай поясам, ботах, у халявы якіх запраўлены штаны, а на галаве папаха. Гаварыў звонкім голасам, азартна. У яго армію запісаліся многія, у тым ліку і вучні настаўніцкай семінарыі.

Сябраваў Новік-Пяюн з выдатным беларускім спеваком Забэйдам-Суміцкім, іх сяброўства працягвалася аж да самай смерці спевака. Яны пісалі адзін аднаму лісты, дзяліліся думкамі, пачуццямі.

Давялося Новіку-Пяюну бачыць акадэміка Яўхіма Карскага, Юзэфа Пілсудскага, сустракацца з Зоськай Верас, многімі іншымі пісьменнікамі, дзеячамі культуры, навукі. Цікава было чуць пра іх ад сучасніка.

Гісторыя. Гісторыя... А жыццё дарыла новыя сустрэчы, часам нечаканыя, непрадбачаныя. У далёкім 1929-м Сяргей Міхайлавіч напісаў верш "Зорачкі". Міналі дзесяцігоддзі. Песня "Зорачкі" трапіла і за акіян, у Злучаныя Штаты Амерыкі. Там яе пачуў Данчык, тады малавядомы на Беларусі. Дванаццаць год спяваў ён гэтую песню. І толькі ў 1989 годзе прыехаў з ёю да яе аўтара. Як горача сустракалі "Зорачкі" ў Мінску, у іншых гарадах! Як пасавала яна настрою спевака! Сапраўдныя сыноўнія пачуцці да Бацькаўшчыны, выказаныя ў мастацкім творы, з часам не паміраюць, а толькі мацнеюць.

Данчык запісаў у асабістай кнізе водгукаў паэта:

*"Дарагому, паважанаму Сяргею Новіку-Пяюну. Як прыемна было з Вамі нарэшце пазнаёміцца і пабываць у Вашай хаце. Не толькі прыемна, але і сапраўдны гонар!*

*Доўгія гады буду ўспамінаць гэты вечар.*

*Шчыра Вам дзякую за Вашы цудоўныя "Зорачкі" і іншыя песні, якія будуць заўсёды жыць.*

*Усяго найлепшага Вам. Сто год".*

А ў красавіку 1993 года:

*"Вельмі паважанаму Спадару Сяргею — як прыемна з Вамі спаткацца.*

*Жадаю Вам усяго самага найлепшага і асабліва — моцнага здароўя...*

*Цалую Вас.*

*Данчык".*

Не забыла Новіка-Пяюна і Юлія Андрусішына — маці Данчыка. Падчас з'езду беларусаў свету ў Мінску ў ліпені 1993 года яна павіншавала яго паштоўкай і падарункам.

— Вось гэтая аўтаручка таксама ад яе, — паказаў Сяргей Міхайлавіч і зрабіў ёй на сваёй кнізе дароўны надпіс мне: *"Глыбокапаважанаму Мікалаю Іванавічу Дзелянкоўскаму на шчыры ўспамін і з падзякай за цёплыя матэрыялы і нястомную працу. Я вельмі рады, што сустрэўся з Вамі, шчыра дзякую за Вашы творы, якія чытаў".*

У захапленні ад гэтага нязломнага духам чалавека я падарыў яму сваю кніжку пра пісьменнікаў. Не хацелася пакідаць гасцінную хату, яшчэ шмат пра што можна было пагаварыць.

Але сустрэцца з Сяргеем Міхайлавічам яшчэ раз не давялося. Новіка-Пяюна не стала. Але застапася беларусам яго паэзія, яго мужны прыклад змагання за светлы лёс Радзімы.

**Мікола ДЗЕЛЯНКОЎСКІ.**

*гісторыка-публіцыстычнае эсэ*

**Аляксандр АЛПЕЕЎ**

# ...І НЕ БЫЛО ЗАЎТРА

### БУДУЧЫНЯ НАРОДА

Мы ўступілі ў трэцяе тысячагоддзе, якое патрабуе ад людзей (у першую чаргу маладых — будучыні краіны) сучасных ведаў, здольнасці самавызначацца, арыентавацца ў свеце, які хутка мяняецца, умення ставіць сабе задачы і, галоўнае, па-дзелавому вырашаць іх. Ва ўсім свеце сёння змяняюцца адносіны да адукацыі, у тым ліку, і нават асабліва — да вышэйшай. Усё больш сцвярджаецца пазіцыя, што ў новым тысячагоддзі менавіта адукацыя стане найважнейшым фактарам прагрэсу.

Гэта патрабаванні сучаснай вытворчасці, самога жыцця. Важна не толькі ўмець чытаць і пісаць без памылак, але і трывала засвоіць камп'ютэрную, прававую, эканамічную, экалагічную пісьменнасць. Інтэлектуальныя рэсурсы краіны ўзрастаюць надзвычай хутка, у геаметрычнай прагрэсіі.

Каб адукацыя па-сапраўднаму была плённай і эфектыўнай, яна павінна базіравацца на агульнай аснове як для настаўнікаў, так і для вучняў. На працягу тысячагоддзяў такой асновай была рэлігія, якую аднолькава і без цэню сумнення прымалі ўсе людзі, незалежна ад узросту, саслоўя, дабрабыту, полу. Цяпер такой цэментуючай асновы ў грамадстве па шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын ужо няма.

Мне глыбока блізкія запаведзі Хрыста, які вучыў людзей дабру, згодзе, любові і павазе да бліжняга, пагардзе да багацця. *"Не собирайте себе сокровищ на земле, где моль и ржа истребляют и где воры подкапывают и крадут, — гаварыў ён, — но собирайте себе сокровища на небе, где ни моль, ни ржа не истребляют и где воры не подкапывают и не крадут. Ибо где сокровище ваше, там будет и сердце ваше. Никто не может служить двум господам: ибо или одного будет ненавидеть, а другого любить, или одному станет усердствовать, а о другом не радеть. Не можете служить Богу и мамоне. Посему говорю вам: не заботьтесь для души вашей, что вам есть и что пить, ни для тела вашего, во что одеться. Взгляните на птиц небесных: они не сеют, не жнут, не собирают в житницы. И Отец небесный питает их. Вы не гораздо ли лучше их? Да и кто из вас, заботясь, может прибавить себе росту хотя на один локоть? И об одежде что заботитесь?.. Не заботьтесь и не говорите: что нам есть или что нам пить, или во что одеваться? Потому что всего этого ищут язычники и потому что Отец ваш небесный знает, что вы имеете нужду во всём этом... Ищите же прежде Царства Божия и правды его, и это всё приложится вам. Итак, не заботьтесь о завтрашнем дне, ибо завтрашний сам будет заботиться о своём: довольно для каждого своей заботы".*

Ёсць вечныя цэннасці ў павучаннях Хрыста. *"Не судите и не судимы будете. Прощайте и прощены будете. Блаженнее давать, нежели принимать. Кто возвышает себя, тот унижен будет, а кто унижает себя, тот возвысится. Будьте милосердны, как Отец ваш милосерден..."*

Ці мог хто за дзве тысячы гадоў існавання хрысціянства аспрэчыць гэтыя ісціны? А ўзяць галоўныя запаведзі з Нагорнай пропаведзі: не забі, не ўкрадзі, не пажадай жонкі бліжняга... Калі б людзі кіраваліся імі!

Не магу зноў не ўспомніць мілую мне вёсачку Рудню, яе простых людзей, якія нечым блізкія бедным людзям старажытнага Усходу, сярод якіх жыў і прапаведаваў Хрыстос. Крадзеж, непавага адзін да аднаго, а тым больш да Бога, лічыліся вялікім грахом, а ў нядзелю — у святы дзень ці якое-небудзь хрысціянскае свята ніхто і падумаць не мог, каб узяць у рукі сякеру ці касу. Усе традыцыі і вераванні народа, якія складаліся стагоддзямі, парушылі, апаганілі, забаранілі бальшавікі, узнёсшыя сябе нават вышэй Бога, разбурылі цэрквы, зняважылі святыні, і ўжо жыццё блізкага нічога не стала каштаваць, кроў чалавечая прыпадобнілася да вады, ліць яе ручаямі ўвайшло ў звычай, у правіла. І што ж, не спасцігла іх хіба Божая кара?

Мне здаецца, у гэтай сувязі мала таго, што кожны культурны чалавек павінен ведаць Біблію, але і самую адукацыю неабходна будаваць на грунце галоўных яе палажэнняў. Іншымі словамі, каб у аснове выкладання і вывучэння кожнага прадмета, дысцыпліны быў стрыжань: для чаго ён — той ці іншы прадмет ці дысцыпліна, назначэнне яго ў гэтым свеце, на карысць ці на шкоду выкарыстоўваюцца чалавецтвам іх асноўныя законы, добрыя стваральныя ці разбуральныя сілы яны выклікаюць.

У 1994 годзе мне ўдалося адным з апошніх "ускочыць на падножку цягніка" з назвай "Вышэйшая адукацыя", стварыць Гуманітарна-эканамічны інстытут. Дзякуй лёсу, пашанцавала выбраць правільны, прыстойны шлях дзейнасці.

Усяго ў Беларусі 12 недзяржаўных ВНУ, колькасць студэнтаў у іх з кожным годам узрастае і цяпер перавышае 30 тысяч. У дзяржаўных ВНУ іх 190 тысяч, таксама ёсць тэндэнцыя да пастаяннага росту, але тут трэба мець на ўвазе, што платнае навучанне ў такіх інстытутах і універсітэтах таксама з году ў год набірае ўсё большыя маштабы і ў некаторых дасягае ўжо паловы ад агульнай колькасці студэнтаў.

Што ўяўляе сабой Гуманітарна-эканамічны інстытут сёння? Тут вучыцца звыш трох тысяч студэнтаў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў — каля 400 чалавек, а ёсць яшчэ і вучэбна-дапаможны персанал, рабочыя і служачыя. Усяго ж у інстытуце працуе і вучыцца каля 4 тысяч чалавек, тут склаўся калектыў аднадумцаў, аб'яднаных адной ідэяй — даць юнакам і дзяўчатам адукацыю самай высокай якасці, выхаваць сапраўдных патрыётаў Радзімы.

Працяг. Пачатак у №№ 1—5.

*здымкі жыцця*

## ЧМЯК!

Гэтым разам вячэрапі мы ўсёй сям'ёй. Здараецца гэта даволі рэдка: то бацька на працы, то маленькі ў садзіку, то я на вуліцы. Маленькі браў кавалачкі гарачай смажанай бульбы, клаў у рот, пачынаў апетытна яе жаваць, пры гэтым гучна чмякаючы. Сапраўды, калі вось так чмякаеш, то і бульба нейкай смачнейшай здаецца.

Слухаў гэтае чмяканне бацька, слухаў, глядзеў, а потым не сцярпеў:

— Маленькі, ці можаш ты есці з закрытым ротам, каб не чмякаць?

А ты, бацька, можаш размаўляць па-кітайску? Вось і ён не можа.

## ГНЯЗДО

Гадоў праз сто такое пабачыш толькі ў заапарку, ды і не ў кожным.

А зараз, атрымліваецца, мы самі нібы ў заапарку.

Так думалі мы, але так не думала маленечкае качанятка, якое дарэмна імкнулася кудысьці ўцячы з высознай травы ля возера.

Мы прыйшлі на возера купацца і не думалі турбаваць птушачку. А ўверсе мітусілася мама-качка і не ведала, што рабіць, як дапамагчы малому.

Некаму з нас прыйшла думка, што мы разварушылі ягоную хату — гняздо. Зламаў — плаці, і мы прыняліся з сена будаваць птушаняці новае гняздо. Атрымалася такое прыгожае (па нашых мерках), пасадзілі туды качанятка, а яно, ведай сабе, працягвае еньчыць ды гукаць маці, якая, як звар'яцелая, носіцца ўверсе.

Чаму ж птушанятка не хоча жыць у нашым гняздзе? А як нас пасадзіць у сабачую будку, дык мы захочам там жыць? Так і тое птушанятка...

Не трэба лезці ў іх жыццё і прымушаць жыць у нашых гнёздах. Проста не бурыць іх уласныя.

## ДЗЕЦІ

Бабулі сядзяць на лаўцы ды гамоняць, гамоняць. Гамоняць гучна — чуваць ажно на ганку, дзе сяджу я.

Манька і кажа:

— Вой, бабы, што я вам скажу!.. Чулі, што Маша ўжо зусім звар'яцела? Прыходзіць учора да мяне і кажа: "Хадзем, Манька, памажы карову падаіць!" А вы ж, бабы, ведаеце, што ў Машы ніколі акрамя курэй ды катоў ніякай жывёлы не было. Але я ўсё роўна пайшла — на ўсялякі выпадак. Прыйшлі да Машы ў хлеў, а там няма ніякай каровы. Я пытаюся: "Ну і дзе ж, Маша, твая карова?". А яна, слухайце, кажа: "Мусіць, збегла кудысьці..."

Ніна пярэчыць:

— Што ты, Манька, хочаш? Машы ж ужо 83 гады. Нам бы не тое, каб не звар'яцець — дажыць бы да гэтага!

А Ганна падхапіла:

— А я ж, бабы, страшэнна баюся здурнець. Бо зранку пакладу зубы ў кішэню, а потым хаджу ўвесь дзень — шукаю.

Гамоняць бабы і не думаюць, што каб у старасці згубіць розум, трэба дужа набрацца яго ў жыцці.

Жыццё — як гара. Чалавек жыве з мэтай залезці на яе вяршыню. А калі ўсё ж залезе — пастаіць там крыху і... пачынае спускацца з іншага боку.

Таму ўсіх старых можна падзяліць на двзе часткі — мудрацоў, якія затрымаліся на той вяршыні, а потым, падскочыўшы, злучыліся з аблокамі; і тых, хто пабег са схілу да зямлі — дзяцей.

І мы, і старыя — дзеці. Але яны, у адрозненне ад нас, ужо не збіраюцца жыць вечна.

## ДУРНІЦА

Тэкля сядзела ля акна і нервова пакусвала ногці. Яе позірк, як тая лінія на аркушыку кардыяграмы, то спакойна ляцеў кудысьці над смешнай і раздражняючай мітуснёй шэрай вуліцы, то кідаўся, як звар'яцелы, спыняючыся на маўклівым тэлефоне, дзвярах, гадзіннику. Па кватэры павольна лётаў пыл, не ведаючы пра броўнаўскі рух.

Тэкля чакала. Яна ўжо звыклася з думкай, што гэткі яе пёс, як у той маппачкі ў цырку, хадзіць на задніх лапках, працаваць і чакаць маленечкага кавалачка цукру.

Тэкля памятала іх першую сустрэчу, першы пацалунак, першы сорам... Яны тады чакалі аўтобус на прыпынку, і ён спытаў: "Можна, я цябе пацалую?" — "Зараз?! — спужалася Тэкля. — Ты што, здурнеў, вакол жа людзі!" Бацькоўскае выхаванне не дазваляла Тэклі нават уявіць сабе такога! Але ён адказаў: "Ну і што тыя людзі? Я цябе кахаю, і ніякія людзі не змогуць гэтаму перашкодзіць". І ўсё ж пацалаваў. Тэкля добра памятала той пацалунак.

Яшчэ яна памятала, як аднаго разу яны трапілі пад моцную навальніцу. Ён тады шапнуў ёй: "Няхай вада лье на нас — ад гэтага наша каханне будзе толькі чысцейшым..." Потым яны сядзелі на канапе, пілі каву і адчувалі, што сапраўды зрабіліся крыху чысцейшыя.

Тэкля памятала ўсё гэта і не хацела яго забываць. Яна чакала. А ўсе казалі ёй: "Дурніца! Плюнь ты на яго. Такіх, як ён, сотні! Знойдзеш сабе іншага".

Тэкля моўчкі слухала, нічога не адказвала, а ўсё ўглядалася кудысьці ўдалеч.

Яна не была дурніцай. Проста яна разумела, што жыць — гэта не толькі дыхаць.

## РЫБА

Хадзілі мы на рыбу. Андрэйка таксама быў з намі. І нешта ў Андрэйкі дужа добра лавілася тая рыба. Быў у яго "сакрэт". Перад тым як закінуць, ён кожны раз казаў:

— Рыбка, рыбка, гэта ж я, Андрушка Панчкоўскі — сябар твой! Ты лавіся на маю вуду, я цябе чапаць не буду. Я цябе карміць добра буду, гуляць з табою. Я ж цябе так люблю!

Ну і гэтак далей.

Пайшлі мы неяк на рыбу без Андрэйкі. І вырашылі трохі "пашаманіць". Кожны з нас закідвае дый балбоча: "Рыбка, рыбка, гэта ж я, Андрушка Панчкоўскі..."

І рыба... пачала лавіцца!

Мабыць, рыба і ведала, што гэта хлусня, але ўсё роўна вылазіла з вады ці то даказаць праўду, ці то паглядзець на статак кланаваных Андрэек.

Зловіцца рыба, гляне, што ашукалі, але ж... маўчыць!

## ЛОГІКА

Ёсць у нашай вёсцы Лявон — хлопец "недапёкі", але працаваць любіць. Шмат чаго няма ў Лявона — і некалькіх зубоў таксама. Таму замест "рыба" атрымліваецца "біба", а замест "булачка" — "буячка". І вось раз папрасілі мы Лявона накапаць нам чарвякоў на рыбу. Лявон — хлопец безадмоўны і таму згадзіўся.

Прыходзіць Лявон праз паўгадзіны і дае нам скрыначку з чарвякамі. Глядзім: усе чарвякі — нібы кабаны — з пацец таўшчынёю.

— Навошта ж, Лявон, ты гэткіх кабаноў накапаў?!

А Лявон і кажа:

— Тоўсты чаўвяк — тоўстая біба!

Шмат чаго няма ў Лявона, але ёсць у яго словах логіка, якой так не хапае некаторым з нас.

## ДЖОЙ

Я прачуў, што ў хуткім часе на славутай Трафальгарскай плошчы з'явіцца яшчэ адзін помнік. Не спеваку, не палітыку і нават не бізнесмену, а сабаку Джою. Чым ён вядомы? Практычна нічым.

Гулялі яны па гэтай плошчы з гаспадаром. Раптам таму зрабілася дрэнна. Выклікалі "хуткую дапамогу", але па дарозе ў бальніцу гаспадар памёр.

А Джой чакаў. Чакаў амаль год і верыў, што гаспадар вернецца.

Добра, каб усе мы былі, як той Джой, і ўмелі чакаць і верыць.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

*крыжаслоў*

### ПЕРАКЛАДЗІЦЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 4. Рисунок. 6. Передок ( в телеге, санях). 7. Уголок. 9. Воспоминание. 10. Кипа. 13. Пар. 14. Лицемер. 17. Облик. 18. Хвастун. 19. Раздолье. 20. Головня. 23. Изобретение. 24. Знамение. 26. Морда. 27. Плюшка. 28. Ковер. 29. Козырёк. 30. Шлёпанцы.**

**ПА ВЕРТЫКАЛІ. 1. Дресва. 2. Затишье. 3. Утюг. 5. Степь. 6. Требователь. 8. Кряжистость. 11. Прицепщик. 12. Ростовщичество. 15. Початок. 16. Слушатель. 21. Наковальня. 22. Улыбка. 25. Мотна. 26. Плот.**

Склаў **Алег КУЛЬЧЫЦКІ.**

### АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ Ў № 51

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Мэта. 3. Біклага. 5. Гронка. 7. Постаць. 8. Абібок. 9. Мова. 10. Агуркі. 11. Ветразь. 15. Конік. 17. Правадыр. 20. Волат. 21. Гумар. 23. Футра. 24. Набытак. 27. Рабаванне. 28. Шыльда. 30. Скарб. 32. Гармата. 33. Верш. 34. Качар. 35. Сонейка. 37. Жораў. 38. Пах. 39. Веды. 40. Пашана.**

**ПА ВЕРТЫКАЛІ. 2. Аўторак. 3. Бацвінне. 4. Адбітак. 5. Гук. 6. Кава. 7. Прадчуванне. 12. Зорка. 13. Падручнік. 14. Рымар. 16. Качка. 18. Пльнь. 19. Бульба. 22. Выслоўе. 25. Крама. 26. Чвэртка. 28. Шворан. 29. Чарада. 31. Рэшка. 32. Грошы. 33. Вежа. 36. Кош.**

*слухай сваё*

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ БЕЛАРУСКІ РОК?

***"Чытаў у вашай газеце пра мноства беларускіх дыскаў з самай разнастайнай музыкай, але ў магазінах Варшавы ні воднага з іх не бачыў. Дзе іх лепей шукаць?"***

***У. БАЗАРЭВІЧ**, студэнт беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта.*

Праблема ў тым, што музычна-выдавецкія пэйблы Беларусі не так моцна стаяць на нагах, каб утрымліваць уласныя музычныя крамы, а тым больш займацца замежным гандлем, таму іх з'яўленне ў звыклых каталогах эпізадычнае. Праўда, зусім нядаўна ў Беларусі пачала працаваць камп'ютэрная крама, якая і вырашыла заняць пакуль свабодную нішу, прапануючы менавіта беларускія CD па аптымальнаму кошту — **http: // CD.Shop.by / 10368. html. У рабочы час там можна атрымаць даведку па тэлефоне ў Мінску (017) 285-24-00.**

Зрэшты, найбольш поўнай інфармацыяй валодае ўжо знакаміты БМА, які выходзіць на сувязь не толькі праз Інтэрнэт, але і праз звычайную пошту. Вось адрасы:

**220085, Мінск, а/с 5, "Музыка — поштай"; пэйджэр 211-85-85 (аб.БМА); www.BMA.home.by**

На сённяшні дзень там можна набыць амаль усё, што выдавалі і БМА, і іншыя выдаўцы ("Каўчэг", "Bulbarecords", "Vigma").

Кампакт-дыскі аўтарскіх альбомаў: 1. **"Крама"** — "Хавайся ў бульбу" (рытм-энд-блюз). 2. **"Без білета"** — "На неба" (паўэрпоп). 3. **"NRM"** — "Тры чарапахі" (грандж). 4. **"Уліс"** — "Падарожжа" (інды-рок). 5. **"Ален"** — "Толькі сон" (бардпопс). 6,7. **"Палац"** — "Лепшае" і "Танчыць Палац" (фольк-мадэрн). 8. **"Крыві"** — "Людзям" (фольк-рок). 9. **"Юр'я"** — "Вэсначуха" (псіхадэлік-фольк). 10. **"Ліцвіны"** — "Ой, у лузе-лузе" (аўтэнтык-фольк). 11. **"Новае неба"** — "Цэпеліны" (інды-бард-рок). 12. **"Zet"** — "З Новым годам" (хардкор, апошнія экземпляры). 13. **"Песняры"** — "2001" (попфольк). 14. **"Стары Ольса"** — **"Вір"** (нью-эйдж). 15. Зміцер Вайцюшкевіч **"Цацачная крама"** (сольны альбом музыканта гурта "Крыві", музычна-паэтычная алегорыя).

Кампакт-дыскі зборных альбомаў: 1. **"Песнярок"** (апрацоўкі песняроўскага рэпертуару ў розных рок-стылях, апошнія экземпляры). 2. **"Сэрца Эўропы in Rock"** (хатні варыянт знакамітага фестывалю "Басовіча"). 3. **"Hard Life — Heavy Music"** (любыя стылі метал-рока на беларускай мове). 4. **"Народны альбом"** (гісторыя Беларусі ў версіі суперзорак рока, апошнія экземпляры). 5. **"Сьвяты вечар-2000"** (рок-зборнік славутых калядных напеваў). 6. **"Я нарадзіўся тут"** (беларускія суперхіты розных часоў у рок-апрацоўках). 7. **"Беларускі турбаМІХэр"** (модная танцавальная музыка).

Серыйныя выданні на кампакт-дысках: 1—3. **"Вольныя танцы" ("Слухай сваё", "Новая альтэрнатыва", "Альтэрнатыва ВУ")** — зборнікі самых модных беларускіх гуртоў, (першыя два амаль скончыліся). 4—6. **"Беларускі музычны архіў"**: оперны тэнар М. Забэйда-Суміцкі, папулярны бард С. Сокалаў-Воюш, хормайстар і кампазітар М. Равенскі, першае выданне ўжо заканчваецца. 7. **"Легенды Вялікага княства"** (гістарычная музыка Беларусі: фальклор, папаца-замкавыя дансінгі, рыцарскі рытуал — замоўлены паўторны тыраж першага выпуску, рыхтуецца другі).

Што датычыць касетных выданняў, іх спіс яшчэ большы і даданкова ўключае розныя альбомы легендарных рок-гуртоў **"Бонда"** і **"Мясцовы час"**, рэлігійную поп-музыку гурта **"New cosmopolis"**, творчасць песенных калектываў беларускай дыяспары — **"Яблынька", "Белы сон", "Кардон", Данчык,** альбомы бардаў, дзіцячыя казкі, літаратурна-пазнавальныя запісы.

**Вітаўт МАРТЫНЕНКА.**

«Голас Радзімы»

Галоўны рэдактар Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма".

Наш адрас: 220005, Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 213-31-97 (бухгалтэрыя, тэл.-факс), 213-32-80, 284-76-56, 213-37-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», не заўсёды супадаюць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 068 экз. Зак. 284. Падпісана да друку 4.2.2002 г. у 12.00.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку». (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).